Мікалай Валынчык ☞ 4

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714



Аляксей Карпюк ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 16 (2814) Год LV | Беласток, 18 красавіка 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Ахопленыя жалобай і мы

Шок. 10 красавіка 2010 года (субота), гадзіна 8.56, ваколіца Смаленска ў Расіі. Самалёт ТУ-154 з прэзідэнтам РП Лехам Качынскім і яго жонкай Марыяй ды 94 найвышэйшымі рангам дзяржаўнымі чыноўнікамі, духоўнымі асобамі, членамі катынскіх сем'яў ды экіпажам разбіваецца пры падыходзе да прызямлення. Праз няпоўныя паўгадзіны Польшчу і ўвесь свет аблятае інфармацыя: ніхто не выжыў. Прэзідэнцкая пара ды спадарожнічаючая ёй дэлегацыя ляцелі ў Катынь, каб аддаць пашану палякам закатаваным тут НКВД.

Каля 10 гадзіны афіцыйна паяўляюцца першыя прозвішчы асоб, якія загінулі. Прэзідэнт, яго жонка, двух віцэ-маршалкаў Сейма, віцэ-маршалак Сената, міністры з Прэзідэнцкай канцылярыі, дэпутаты і сенатары, камандзіры ўсіх фармацый Узброеных сіл РП, старшыні Інстытута нацыянальнай памяці, Нацыянальнага польскага банка, сакратар Рады аховы помнікаў змагання і пакут, духоўныя асобы... — пералічваюць журналісты ўсіх польскіх тэле- і радыёстанцый, якія спынілі планаваныя перадачы. Беластачане, падляшы не вераць. Сярод ахвяр апынуліся людзі родам ад нас: апошні прэзідэнт РП на чужыне Рышард Качароўскі, віцэ-маршалак Сейма і шэф падляшскага ПіС Кшыштаф Путра, праваслаўны ардынарый Войска Польскага генерал брыгады архіепіскап Міран (Міраслаў Хадакоўскі), сцюардэса прэзідэнцкага самалёта Юстына Манюшка. Яшчэ да суботняга поўдня пад беластоцкімі помнікамі Юзафу Пілсудскаму і папу Яну Паўлу II пачынаюць палаць першыя знічы, ускладзены першыя кветкі. З гадзіны ў гадзіну іх штораз больш і больш. Нават функцыянеры мундзірных службаў не ў змозе схаваць слёз.

— Гэта немагчыма. Не веру, — паўтарае гурт людзей, якія прыйшлі ўшанаваць памяць загінуўшых.

Прыгадваюцца словы прэзідэнта Леха Качынскага, таксама тыя пра Беларусь з канца лютага (у падобным тоне выказваўся, між іншым, святой памяці шэф яго Канцылярыі Владыслаў Стасяк):

— Тое, што сустракае палякаў у Беларусі, гэта справа нашай краіны і ўсяго Еўрапейскага Саюза. Польшча заступаецца не толькі за сваімі землякамі, ды і ўніверсальнымі, асноўнымі прынцыпамі. Абараняем адкрытае грамадства, у якім ёсць месца для нацыянальных меншасцей і апазіцыі, якой правы ў Беларусі парушаюцца. Хачу заклікаць Еўрасаюз да салідарнасці, якая нашым землякам і ўсім тым, што хочуць змен у Беларусі, вельмі патрэбная.

Прэзідэнт Лех Качынскі памятаў таксама аб тутэйшых беларусах. Гэта ён узнагародзіў беларускіх гісторыкаў, апазіцыйных дзеячаў у 1980-х гадах Алега Латышонка і Яўгена Вапу — Афіцэрскім Крыжам Ордэна Адраджэння Польшчы.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

На беластоцкім рынку выстаўленыя партрэты загінуўшых звязаных з Падляшшам

Вяртаюцца таксама думкі віцэ-маршалка Кшыштафа Путры з таго часу:

— Падтрымка беларускай дэмакратычнай апазіцыі — у польскім інтарэсе. Дэмакратычная сістэма ў Беларусі стварае магчымасць дзейнасці для свабодалюбівых рухаў і згуртаванняў.

Беластачане прыгадваюць сабе не такі даўні — як аказалася апошні — візіт прэзідэнта Качароўскага ў сталіцы падляшскага рэгіёна. Перадаў ён тады бібліятэцы Універсітэта ў Беластоку значную частку свайго лонданскага кнігазбору. У Свята-Мікалаеўскім саборы ардынарый Беластоцка-Гданьскай епархіі ў час жалобнага набажэнства не верыць у тое, што здарылася, таксама як і вернікі, асабліва аплакваючыя архіепіскапа Мірана:

— Яшчэ ў сераду я з ім вёў гутарку. Расказваў аб выедзе ў Катынь. Ніхто гэтага не спадзяваўся.

Прэзідэнт Лех Качынскі меў пачаць сваю прамову ў катынскім лесе:

— У красавіку 1940 года больш за 21 тысячу польскіх палонных з лагераў і турмаў НКВД тут закатавалі. Гэтае злачынства генацыду было па волі Сталіна, па загадзе найвышэйшых улад Савецкага Саюза. Саюз III Рэйха і СССР — пакт Рыбентропа-Молатава, агрэсія на Польшчу 17 верасня знайшлі сваю жахлівую кульмінацыю ў катыньскім злачынстве.

Меў адзначыць:

— Катынь стаў балючай ранай польскай гісторыі, але таксама на доўгія дзесяцігоддзі атруціў адносіны паміж палякамі і расіянамі. Пасадзейнічайма таму, каб катыньская рана магла поўнасцю загаіцца і зацягнуцца. Мы ўжо на добрым шляху. Мы, палякі, цэнім дзеянні расіян з апошніх гадоў. Гэтай дарогай, якая набліжае адзін да аднаго нашы народы, павінны мы ісці далей, не спыняючыся на ёй і не адыходзячы назад.

У суботу ў 23 гадзіну прэм'ер Расійскай Федэрацыі заяўляе ў пасланні палякам:

— Гэта таксама наша трагедыя.

Расія, Літва, Украіна, а нават Бразілія назначаюць дні нацыянальнай жалобы ў сваіх краінах. Таксама нацыянальныя меншасці ў Польшчы не скрываюць суму і шкадавання. Ахопленыя жалобай і мы — грамадзяне РП беларускай нацыянальнасці. Памятаем.

Рэдакцыя

Пакліканыя ў Царства Нябеснае

Усе словы, выказаныя разам у гэтыя дні, не ў змозе апісаць маштабу таго болю, з якім прыйдзецца жыць гадамі сем'ям і блізкім людзей, загінуўшых у авіякатастрофе пад Смаленскам. Загінула першая пара нашай дзяржавы: прэзідэнт Лех Качынскі з жонкай Марыяй і яшчэ дзевяноста чатыры не менш вартасныя чалавечыя жыцці. Таму задумлівае маўчанне і поўная павагі жыццёвая штодзённасць хіба самы лепшы доказ нашай чалавечнасці і салідарнасці з загінуўшымі. Смерць не выбірае, толькі забірае. Загінуўшую у катастрофе самалёта палітычную эліту Польшчы паклікаў да сябе Бог у першы тыдзень пасля Вялікадня, тады, калі ў адпаведнасці з народна-царкоўнай традыцыяй райскія вароты ўвесь час адкрытыя і,адыходзячыя з зямнога жыцця трапляюць непасрэдна ў рай. І няхай так збудзецца. Трагедыя ўзрушыла ўвесь свет, напамінаючы яшчэ раз пра адвечнае пытанне пра цану жыцця і смерці. І кожны перажывае гэта па-свойму, так у чалавечым, як і дзяржаўным вымярэнні. Нам застаецца толькі разлічваць на тое, што пасля гэтай катастрофы не пачнуцца жахлівыя палітычныя гульні і сённяшнія словы пра агульнанацыянальную ўзаемапашану і згоду не закончацца разам з цырымоніяй пахавання загінуўшых. Але тады свой рахунак палітыкам выставяць гісторыя і грамадзяне краіны.

Трагедыя мае непасрэднае дачыненне і да нашай Падляшскай зямлі, на якой здаўна жывуць і надалей будуць будаваць сваю будучыню разам палякі і беларусы, каталікі і праваслаўныя. Удзельнічаючы ў нядзельнай царкоўнай багаслужбе, услухаўся я таксама ў тое, што пра трагедыю думаюць звычайныя прыхаджане. Апрача большасцю адчувальнай, незвычайнай пашаны і павагі да сітуацыі, у якой ахвярай трагедыі стаў і праваслаўны архіепіскап Міран, прыйшлося мне і наслухацца думак, якія можна назваць ірацыянальнай змоўніцкай тэорыяй гісторыі і хрысціянства. Лічу, што звычайным абавязкам кожнага з нас, як хрысціяніна, веруючага, так і няверуючага чалавека, з'яўляецца супрацьдзеянне фальшывым тэорыям і абсурдным плёткам. Гэтага менавіта патрабуе нашая павага да ўсіх загінуўшых у авіякатастрофе пад Смаленскам.

Яўген ВАПА

Агульная трагедыя

Трагедыя, якая здарылася пад Смаленскам, стала сапраўдным шокам не толькі ў Польшчы, але і на ўсёй еўрапейскай прасторы. Маштаб авіякатастрофы цяжка асэнсаваць нават праз некаторы час пасля здарэння. Маштаб нацыянальнай бяды і страты для Польшчы невымерны. Такія чорныя падзеі жорстка скаланаюць грамадства, а іх наступствы цяжка прадказаць. У такія дні надыходзіць сапраўдная пераацэнка з'яў і поглядаў, стаўлення і стасункаў.

У Гродне ў дзень трагедыі і наступныя суткі да консульства Польшчы прыходзілі людзі розных нацыянальнасцей, веравызнанняў і поглядаў. Прыходзілі не па нейкім закліку, ці тым больш загадзе. Прыходзілі і ставілі знічкі, клалі кветкі таму, што калі здараецца вялікая бяда ў суседа, аніводны нармальны чалавек не можа заставацца абыякавым і з большай ці меншай ступенню перажывання прапускае трагедыю праз сябе. У гэтыя дні давялося размаўляць з дзесяткамі розных людзей і адчувалася, што кожны з іх сапраўды ўзрушаны, прыбіты асабіста, поўны спачування сваякам тых, хто загінуў.

Ад гэтага часу гістарычная катыньская трагедыя дапоўніцца страшнай смаленскай катастрофай. Катыньская трагедыя — гэта і наша беларуская трагедыя. Катастрофа самалёта са шматлікімі польскімі дзяржаўнымі і грамадскімі дзеячамі — і наш беларускі боль. І толькі дзяржава пад назвай Рэспубліка Беларусь не адгукнулася належна на гэтую катастрофу, не абвясціла ў краіне хоць бы адзін жалобны дзень, як гэта зрабілі ўсе суседзі Польшчы — Украіна, Літва, Расія, больш аддаленыя дзяржавы. Прынамсі, не зрабіла гэта на момант, калі пішуцца гэтыя радкі (ажно праз двое сутак пасля трагедыі). Наадварот, па каналах псеўдабеларускага тэлебачання згодна з ранейшай праграмай транслявалісь забаўляльныя, музычныя перадачы. Што ж кіраўніцтва РБ чарговы раз паказала сваё хамскае аблічча, нялюдскае захаванне. Яны і пра Катынь за ўвесь час свайго кіравання не сказалі ні слова праўды, замоўчвалі і надалей хаваюць і адсоўваюць гэтую драматычную падзею гісторыі. Многія беларусы дагэтуль не ведаюць, што насамрэч адбылося ў Катыні. Не ведаюць пра тое, што разам з польскімі афіцэрамі і жаўнерамі былі расстраляны і соткі, а па некаторых даных, нават тысячы беларускіх вайскоўцаў. Сярод іх быў, прыкладам, Францішак Умястоўскі, рэдактар першай беларускай газеты „Наша доля", але імёны большасці забітых там суайчыннікаў дагэтуль невядомыя. Мала хто бачыў фільм выдатнага польскага рэжысёра Анджэя Вайды „Катынь". Маладому пакаленню ў Беларусі навязваюць якраз адваротнае, адкрыта фальшуючы гісторыю другой сусветнай вайны, навязваючы ўсялякія „лініі Сталіна" і абсурдны гераізм, уганароўваюць былых энкавэдыстаў пад шыльдай шанавання ветэранаў вайны.

Справа Катыні да гэтага часу не закрытая ў палітычна-прававым аспекце. Каб яе закрыць, трэба зрабіць дзве прынцыповыя рэчы: апублікаваць усе архіўныя дакументы, якія датычаць гэтай справы, а таксама рэабілітаваць усіх расстраляных без віны. Рэчы досыць простыя і зрабіць гэта можа толькі расійскае кіраўніцтва. Бо Расія — гэта правапераемнік СССР. Правапераемнік — не значыць саўдзельнік. Трагедыя пад Смаленскам — гэта шанц для расійскага грамадства на катарсіс, на свой нюрнбергскі працэс над сталінізмам, які як з'ява зноў пачынае ўздымаць галаву. Толькі асабіста я не веру, што сённяшні Крэмль здольны на такі натуральны крок, на цвёрдае асуджэнне савецка-сталінскага мінулага. Нягледзячы на нібыта годнае захаванне ў час пасля гэтай авіякатастрофы.

Пра тое, што стала сапраўднай прычынай катастрофы самалёта савецкай вытворчасці, на якім ляцелі польскія палітыкі і дзеячы, мы можам не даведацца ніколі. І нават калі будзе выразнае заключэнне экспертных камісій, застануцца пытанні і сумневы. Што гэта было — фатальная наканаванасць ці чалавечы фактар, непазбежнасць лёсу ці нешта зусім іншае? Зрэшты, гэта не самае галоўнае. Галоўнае зараз — гэта зрабіць высновы з гісторыі і мацаваць нашу салідарнасць.

Схіляем галовы і молімся ў нашых дамах і храмах за загінуўшых...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Спачуванні з Беларусі

Фота Зміцера Косціна

Патрыяршы экзарх усяе Беларусі мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт выказаў спачуванні ў сувязі з гібеллю прэзідэнта Польшчы Леха Качынскага і яго спадарожнікаў. Тэкст спачування размешчаны на афіцыйным інтэрнет-партале Беларускай праваслаўнай царквы. „Вера ва ўваскрэсенне мёртвых, якая аб'ядноўвае нас незалежна ад дзяржаўных межаў, палітычных поглядаў і меркаванняў, няхай будзе галоўным суцяшэннем усім тым, хто смуткуе аб гэтым горы. Разам з народам Польшчы малюся аб супакаенні загінулых", — гаворыцца ў спачуванні патрыяршага экзарха.

* * *

Беларускія каталікі далучыліся да жалобы, якая трывае ў Польшчы з нагоды катастрофы ў Смаленску. У памяць ахвяраў прайшлі памінальныя службы ў мінскіх касцёлах ды парафіях Грэка-Каталіцкай царквы. У Кафедральным касцёле ў Мінску святую імшу ў памяць загінуўшых ахвяраў пад Смаленскам узначаліў арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч. Таксама далучылася да жалобных службаў і Грэка-Каталіцкая царква.

* * *

Міністр замежных справаў Беларусі Сяргей Мартынаў перадаў спачуванні міністру замежных справаў Польшчы Радаславу Сікорскаму ад імя беларусага народа з нагоды трагедыі, якая адбылася сёння пад Смаленскам. Пасольства Рэспублікі Беларусь таксама перадае спачуванні польскаму народу. Пасольства Беларусі з вялікім жалем і смуткам успрыняла інфармацыю аб гэтай страшнай трагедыі. Гэта трагедыя польскага народа. Гэта трагедыя, якой не было ў найноўшай гісторыі свету, — адзначае генеральны Пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы **Віктар Гайсёнак.**

* * *

У сувязі з гібеллю прэзідэнта Польшчы Леха Качынскага і членаў польскай дэлегацыі ў авіякатастрофе ў Смаленскай вобласці Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія спачуванні маршалу Сейма Браніславу Камароўскаму, а таксама родным і блізкім загінулых, паведаміла прэсавая служба беларускага кіраўніка. «Велізарнае гора абрынулася на блізкую нам дзяржаву, з якой Беларусь звязваюць даўнія роднасныя, гістарычныя і культурныя сувязі. Пачуццё глыбокага смутку па трагічна загінулых у катастрофе Прэзідэнце і грамадзянах Рэспублікі Польшча апанавала нашыя сэрцы. Кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь і ўвесь беларускі народ выражаюць шчырыя спачуванні родным і блізкім загінулых, а таксама польскім уладам. Мы разумеем, якія незаменныя страты для народу Польшчы прынесла гэтая трагедыя. У надзвычай цяжкі для вашай краіны час прыміце словы нашай падтрымкі і глыбокага спачування» — чытаем у паведамленні кіраўніка Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

* * *

Ірына Лаўроўская, гісторык і архітэктар з Брэста, напісала і скіравала ў Адміністрацыю Лукашэнкі ліст наступнага зместу:

Паважаныя супрацоўнікі прыёмнай прэзідэнта Рэспублікі Беларусь! Звяртаюся да вас у справе, якая мяне і многіх беларусаў моцна ўзрушыла, закранула і асабіста, і па-грамадзянску. Беларусь сёння разам з польскім народам перажывае вялікі смутак і боль страты 96-ці годных сыноў і дачок Польшчы. Смуткуем таксама і спачуваем у сувязі са смерцю прэзідэнта Леха Качынскага і ягонай жонкі. Назіраем, як годна рэагуюць іншыя дзяржавы на боль Польшчы... З вялікім здзіўленнем бачым, як наша краіна, найбліжэйшая да Польшчы і з пункту бачання гісторыі, і з пункту бачання геаграфічнага, абмежавалася дыпламатычнай дапамогай родным ахвяраў пры транзітным пераездзе мяжы... Я адчуваю сорам за сваю краіну, кіраўнік якой мае неадпаведную высокаму становішчу грамадзянскую і чалавечую пазіцыю. Калі ласка, урэгулюйце праблему, зрабіце нейкія захады, каб Беларусь таксама абвясціла траўр у сувязі з трагедыяй пад Смаленскам. Інакш чарговая ганебная пляма пыхі і непрыстойнага выхавання адной высокай асобы, пакладзецца чарговай ганебнай плямаю на сумленне і гонар нашага народа.

На аснове www.racyja.com

Вачыма еўрапейца

Інфармацыя МЗС 2010

Толькі ў мінулым тыдні міністр замежных спраў Радаслаў Сікорскі прадставіў у Сейме інфармацыю аб прынцыпах замежнай палітыкі Польшчы ў 2010 годзе. У гэты раз, дарэчы, падобна як і яго папярэднікі, засяродзіўся на матыве адносін з Беларуссю пасля абмеркавання зносін з іншымі ўсходнім суседзямі: Расіяй і Украінай, і перад Малдовай і Грузіяй. Беларусі прысвяціў больш-менш столькі ж часу, колькі Украіне і Грузіі. Ягоныя меркаванні прадстаўлены ў інфармацыі, і прысвечаныя Беларусі, прывяду тут поўнасцю:

— З увагай і зычлівасцю прыкмячаем узмацнянне беларускай дзяржаўнасці. Ды ў постсавецкіх рэаліях незалежнасць не можа грунтавацца без прагрэсу дэмакратыі. Таму, дэкларуючы волю шырокага супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь, нязменна заахвочваем беларускія ўлады да сістэмнай змены. Гэтая змена павінна ахопліваць, згодна з прынцыпамі дэмакратыі і правоў чалавека, права на свабоднае гуртаванне, што асабліва адносіцца да польскай меншасці, чаго патрабуем.

Цікава прагучалі выказваныя потым словы, хоць без пералічвання з назвы Беларусі:

— Хочам, каб нашы ўсходнія суседзі мелі магчымасць падарожнічаць у Польшчу і іншыя еўрасаюзныя краіны без лішніх абмежаванняў.

Вядома, шмат матываў, аб якіх гаварыў шэф польскага МЗС, адносілася таксама да Беларусі, калі ўспамінаў аб праграме „Усходняе партнёрства". У час дэбаты над яго інфармацыяй дэпутаты няраз вярталіся да праблемы рэпрэсій у адносінах да Саюза палякаў Беларусі Анжалікі Борыс ды асабліва ў гэтым кантэксце да сустрэч міністра Сікорскага з Аляксандрам Лукашэнкам і яго беларускім калегам Сяргеем Мартынавым.

— Гэтыя візіты былі без сумнення выкарыстаныя беларускімі СМІ для выказання правамоцтваў палітыкі рэжыму, — гаварыла шэф клуба ПІС Гражына Генсіцкая (+10.04.2010). — Замежная палітыка гэта м.інш. адказнасць за тых беларусаў і палякаў, якіх сёння праследуюць. У замежнай палітыцы ёсць такія моманты, калі трэба выбраць, на якім мы баку.

Марэк Бароўскі з клуба Польскай сацыял-дэмакратыі:

— Мы павінны адмовіцца ад пазадыпламатычных дзеянняў — гаворка аб павелічэнні фінансавання тэлебачання БелСат і Радыё Рацыя, аб значным пашырэнні стыпендыяў і стажыровак у польскіх установах для маладых беларусаў.

Найбольш месца Беларусі прысвяціў у час дэбаты падляшскі дэпутат ГП Роберт Тышкевіч, віцэ-старшыня камісіі замежных спраў і старшыня парламенцкай групы па справах Беларусі. Успомніў ён між іншым:

— Лёгка засядаць у Варшаве ў выгадным кабінеце і вяшчаць ганарыстыя і палымяныя дэкларацыі. Цяжэй стаць тварам у твар з дыктатарам і размаўляць, дамагаючыся правоў нашай меншасці (...). Працягваецца дыялог, працягваюцца размовы, затое няма генеральнай дэкларацыі. Здаецца, што з гэтага варта рабіць вывады наконт працягу нашай палітыкі.

Міністр Сікорскі ў адказ на папрокі наконт яго сустрэч з найвышэйшымі рангам прадстаўнікамі беларускага рэжыму заявіў:

— Я запрасіў міністра замежных спраў Беларусі і быў ён у Варшаве для таго, каб падпісаць дамову аб малым памежным руху. Ці вы сапраўды хочаце, каб я пакараў сотні тысяч беларусаў і палякаў за тое, што робіць прэзідэнт Лукашэнка і не падпісаў гэтай дамовы? Падумайце аб гэтым, пакуль паставіце перада мною закіды, звязаныя з рэпрэсіямі ў адносінах да палякаў у Беларусі.

Дык вось?!

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Чаму наш родны кут становіцца чужым?

Тэкст і фота Яна МОРДАНЯ

Па запрашэнні падляшскага ваяводы Мацея Жыўны на сустрэчу 8 сакавіка (пра якую пісала „Ніва" № 12) прыехалі тры асобы з Таварыства „Гай". Звярнуліся мы да прадстаўніка Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі Юзэфа Ружанскага, дырэктара дэпартамента канфесій ды нацыянальных і этнічных меншасцей, з набалелай праблемай сялян з Райска і Гацькоў. Закон ад 6 студзеня 2005 г. „Аб нацыянальных і этнічных меншасцях, і рэгіянальнай мове" змяшчае вось такія артыкулы:

„**Арт. 5.** 1. Забараняецца выкарыстанне сродкаў, мэтай якіх з'яўляецца асіміляцыя асоб, прыналежных да меншасці, калі дадзеныя сродкі выкарыстоўваюцца насуперак іх волі.

2. Забараняецца выкарыстанне сродкаў, мэтай якіх з'яўляецца змена нацыянальных ці этнічных прапорцый на тэрыторыі пражывання меншасці.

Арт. 6. 1. Забараняецца дыскрымінацыя з-за прыналежнасці да меншасці.

2. **Органы публічнай улады абавязаныя выкарыстоўваць адпаведныя сродкі з мэтай:**

1) падтрымкі поўнай і сапраўднай роўнасці ў галіне эканамічнага (вылучэнне Я. М.), грамадскага, палітычнага і культурнага жыцця паміж асобамі, прыналежнымі да меншасці, і асобамі, прыналежнымі да большасці;

2) абароны асоб, якія з'яўляюцца аб'ектам дыскрымінацыі, варожасці ці насілля з-за іх прыналежнасці да меншасці;

3) узмацнення міжкультурнага дыялогу".

Папрасіў я звярнуць увагу, што на пачатку ёсць: „эканамічнага" і „грамадскага", а „культурнага" на канцы. На такога роду сустрэчах шмат гаворыцца пра культурную дзейнасць ды забываецца пра эканамічную і грамадскую сітуацыю нацыянальных меншасцей.

І вось Ірэна Цішук — солтыс Райска, вёскі з багатым ды трагічным мінулым, сказала пра самую балючую сялянам цяпер справу. Якім чынам 115 гектараў найлепшых сельскагаспадарчых угоддзяў у Райску стала ў 2006 годзе ўласнасцю Люблінска-Холмскай епархіі? Спрадвеку на зямлі ў Райску гаспадарылі мясцовыя сяляне. Ці гэта нармальна, каб за крыўду, учыненую польскай дзяржавай у даваенны час, крыўдзіць цяпер сялян Райска, якіх і так нямнога засталося? Прысутны на сустрэчы Мікалай Федарук, адзін з гаспадароў, пачаў чытаць петыцыю да ўрада Польшчы, якую выслалі ў снежні мінулага года. Сяляне з Райска звярнуліся з просьбай разгляду і вырашэння справы перадачы 115 гектараў зямлі ва ўласнасць Люблінска-Холмскай епархіі, не зважаючы на артыкул 23 Канстытуцыі РП: **„Podstawą ustroju rolnego państwa jest gospodarstwo rodzinne".**

І тут чытанне гаспадара з Райска спыніў дырэктар Ружанскі з МУСіА, заяўляючы, што справа не датычыць закону аб нацыянальных і этнічных меншасцях. Тады папрасіў дазволу

выступіць старшыня Беларускага саюза ў РП Яўген Вапа, які рашуча заявіў, што чыноўнікі Агенства сельскагаспадарчых маёмасцей распараджаюцца дзяржаўнай зямлёй з крыўдай для мясцовых сялян. Праблема цягнецца некалькі гадоў і патрабуе належнага вырашэння, каб гаспадары з беларускіх вёсак не выязджалі „за хлебам" у Брусель.

Дырэктар Ружанскі сказаў, што дасюль не ведаў аб праблеме і пабяцаў пацікавіцца справай ды ласкава дазволіў выступіць мне як старшыні Таварыства „Гай". І я пакарыстаўся такім дазволам:

— Жывем у такой рэчаіснасці, калі мы, грамадзяне Рэчы Паспалітай Польскай, удзячныя за тое, што можам карыстацца роднай мовай ды спяваць свае песні. На жаль, штораз менш такіх асоб, якія хочуць заставацца беларусамі. Большасць людзей найперш клапоціцца пра матэрыяльныя патрэбы, і не надта хочацца спяваць ды танцаваць, калі не хапае сродкаў у штодзённым жыцці. Няёмка адчуваць сябе бяднейшымі грамадзянамі ды хадайнічаць за датацыямі на культурную дзейнасць. Прадстаўнікі Таварыства „Гай" прыехалі на сустрэчу, каб прад'явіць праблему сялян „беларускіх" вёсак Бельшчыны ў гаспадарчай і грамадскай сферы. Наша арганізацыя, як паказвае назва (Гай — урочышча ў Гацьках), узрасла з зямлі. Пасля некалькіх дзесяткаў гадоў навуковых доследаў вучоныя выказваюць, што ў Гацьках знаходзіцца самабытны краявід беручы пад увагу геабатанічныя ды археалагічныя каштоўнасці. Выдадзена ў 2006 годзе знакамітая манаграфія „Гацькі. Прыродна-археалагічны комплекс на Бельскай раўніне", у якой прафесар Януш Фаліньскі сцвердзіў:

„Незвычайнае хараство і батанічнае багацце Гацькоў ды захаваныя пад муравой сведчанні мінулага, гэта частка спрадвечнай сувязі чалавека з зямлёй. Пераказваем інфармацыю з просьбай клапатліва зберагчы каштоўнасці; надзвычайны рэльеф, помнікі старадаўнасці і квяцістую мураву, якія не змаглі сфармавацца нідзе ў іншым месцы. Усё тут нашае, дык зберагаць такое дабро абавязаны кожны!"

Аднак запавет гэты не даходзіць чамусьці да чыноўнікаў. Ужо больш дзесяці гадоў Таварыства „Гай" звяртаецца ў розныя органы адміністрацыі з просьбамі ды прапановамі дзеля належнай аховы і добраўпарадкавання краявіду ў Гацьках. **Аднак вынік такі, быццам гарохам аб сцяну.** Чаму дзяржаўныя і гмінныя чыноўнікі прыхільна ставяцца да патрэб аднаго арандатара з іншай гміны, ды абыякава ў справе захавання археалагічных і прыродных каштоўнасцей. А да таго арандатар сямідзесяці гектараў „дзяржаўнай" зямлі ў Гацьках выразаў без дазволу шмат дрэў ды зараў дзесяць гектараў сенажаці з квяцістай муравой у месцы знаходжання археалагічных знаходак.

Вядомая ісціна, што найлепшымі гаспадарамі кожнага месца могуць быць толькі мясцовыя жыхары. Адміністрацыйныя органы ў дэмакратычнай дзяржаве абавязаны законамі запэўніць ім адпаведныя ўмовы, і не толькі ў галіне культуры. Пры нагодзе для прадстаўніка МУСіА Юзэфа Ружанскага перададзена яшчэ заява гаспадароў з Гацькоў адносна валодання ўчасткам зямлі (71,64 гектараў) з дзяржаўнай маёмасці:

„Уведамляючы неад'емнае права на спадчыну на абшары сваёй вёскі, паведамляем гэтым, што ўказаным зямельным участкам ад 1999 года валодае селянін з гміны Вышкі, які стаў арандатарам у невядомых для нас акалічнасцях. Перад гэтым некаторыя з сялян з Гацькоў звярталіся ў адміністрацыю з заявамі скарыстання гэтымі ўгоддзямі, аднак не атрымалі такой магчымасці. Цяперашні арандатар на працягу дзесяці гадоў апрацоўвае грунты грузавымі сельскагаспадарчымі машынамі, падсяваючы насенне высокапрадуктыўных раслін ды з выкарыстаннем хімічных сродкаў, а ў апошнім годзе заараў частку шматгадовых пашаў, <u>што з'яўляецца нязгодным з указаннямі навукоўцаў</u>. На гэтым участку некалькі разоў былі ссечаны дрэвы ды выкарчавана кустоўе ў розных месцах са стратай для эстэтыкі краявіду і выступаючай фаўны. Невядома нам, ці быў на гэта выдадзены адміністрацыйны дазвол.

Увесь указаны зямельны ўчастак ахоплены абшарам еўрапейскай сеткі аховы прыроды „Натура 2000", беручы пад увагу вельмі цэнныя ачагі расліннасці і тут знаходзяцца ўнікальныя археалагічныя помнікі старадаўнасці, занесеныя ў Ваяводскі рэестр помнікаў.

Мы, мясцовыя сяляне, дасюль былі пазбаўлены магчымасці павелічэння плошчы сямейных гаспадарак набываючы ўгоддзі распаложаныя абапал нашых зямельных участкаў, а тым самым і гаспадарчай карысці падчас грамадска-эканамічных перамен.

Такую сітуацыю лічым дыскрымінацыяй ды абмежаваннем доступу да сваёй спадчыны. Мы, быўшы мясцовымі гаспадарамі ад многіх пакаленняў, узаемазалежныя ад прыродна-культурнага ландшафту, дзе жывем ды атаясамліваемся з ім і таму можам забяспечыць найлепшую ахову цэнных прыродных ачагоў і самабытнага археалагічнага краявіду. Уведамляючы сваю павіннасць захавання нашчадкам такіх цэннасцей, лічым што дзеля гэтага патрэбныя юрыдычныя, арганізацыйныя і фінансавыя ўмовы згодна з законамі ў дэмакратычнай дзяржаве".

Пад заявай падпісалася сямёх гаспадароў з Гацькоў.

Некалькі гадоў дзейнічаў я на беларускай культурнай ніве і сваё выступленне закончыў паэтычнымі словамі Уладзіміра Караткевіча:

Сэрца каня ірвецца,
Ў сэрцы конніка боль:
Радзіма твая прадаецца,
Кожны псяр над ёю — кароль.
Прадаюцца жанчын нашых вочы,
Прадаюцца калыска і храм,
Прадаюцца ўсім, хто захоча:
Ворагу й хцівым сябрам.
Прадаецца з бязмежкам дубовым,
З продкавым ачагом,
Прадаецца з золатам мовы,
З былым і будучым днём.
Прадаецца ўся і па частках,
За грошы і напавер.
І дзе скажуць: „Айчына"
— там пастка.
І дзе скажуць: „Хрыстос"
— там звер.
І сумленне, і воля святая
Дрыжаць на апошняй струне...
Што там недзе зямлю расцінае?
Гэта Расце Гнеў!

Пасля нашага выступлення ніякіх пытанняў падчас сустрэчы не пачулася. Толькі падляшскі ваявода Мацей Жыўна, да якога Таварыства „Гай" на працягу двух гадоў звярталася за дапамогай, сказаў, што праблемы ў Райску і Гацьках сур'ёзныя, якія павінны вырашацца ў гмінным самакіраванні. Выглядае на тое, што прадстаўнік урада польскай дзяржавы не ў змозе дапамагчы сялянам у „беларускіх" вёсках. Таварыства „Гай" у ліпені мінулага года атрымала ад ваяводы даволі надзейнае пісьмо, у якім выказаў ён ***„сваё вялікае прызнанне членам Таварыства „Гай" і жыхарам Гацькоў у сувязі з узняццем дзеянняў па захаванні неацэнных каштоўнасцей краявіду, які павінен ахоўвацца. Такая задума не часта сустракаецца і таму ініцыятыва мясцовай грамадскасці заслугоўвае падтрымкі.***" Аднак апрача прыгожых слоў, не толькі ваяводы, дапамогі ніадкуль. Вельмі арыгінальны падыход падляшскага ваяводы да справы. Захаванне надзвычай цэннага прыродна-археалагічнага краявіду ў маштабе цэлай Польшчы, а нават Еўропы, паводле ваяводы, належыць толькі да абавязкаў гмінных улад. Навошта тады існуюць розныя дзяржаўныя органы ўлады ды такія установы як Падляшская ўправа аховы помнікаў і Рэгіянальная дырэкцыя аховы асяроддзя?

Ужо пасля сустрэчы ў ваяводскай управе Таварыства „Гай" атрымала інфармацыю з Агенцтва сельскагаспадарчых маёмасцей, што 22 лютага 2010 года прададзена 48,60 гектараў зямлі ў Гацьках арандатару Гжэгажу Лучаю, згодна з прыслугоўваючым першынствам. Цяпер самы буйны ўласнік зямельных угоддзяў на абшары Гацькоў жыве у Варпэхах-Старых у гміне Вышкі. Чаму ў гэтай гміне не хапіла пядзідзесяці гектараў для Гжэгажа Лучая? А дзе шукаць зямлі гаспадарам з Гацькоў і Райска? Выглядае на тое, што для іх замест спадчыны застаюцца пытанні. Чаму наш родны кут становіцца чужым?

Нараўчанская гміна

„Ніва” піша пра нашыя справы

У другой палове сакавіка гэтага года „Нівай”, між іншым нумарам 13, цікавіліся чарговыя чытачы: радны з Тарнопаля Ян Сухадола, Лявон Хлябіч і Яўгенія Вярбіцкая з Нараўкі, Анна Несцярук і Вольга Адамюк з Ахрымоў, Мікалай Казлоўскі і Мікалай Харкевіч з Навін, Яўгенія Марчук, Рафал Харкевіч, Марыя Пучынская, Ніна Карпюк, Аляксандр Кучка, Ірына і Мікалай Лаўрэшукі (спадар Мікалай з'яўляецца солтысам вёскі Новае Ляўкова), Канстанцін Максімюк, Ян і Марыя Янелі, Людміла і Барыс Казлоўскія, Ірына Харкевіч ды Вольга і Ян Сахарчукі з Новага Ляўкова.

Марыю Янель з Ляўкова асабліва зацікавіў допіс „Бяроза трымаецца на валаску” (яц). Яна непадалёк ад тае бярозы жыве.

— Цешыць нас тое, — сказала, — што „Ніва” пачала больш пісаць пра нашыя мясцовыя справы. — У сваёй хаце я павесіла на сцяне „Ніву” з беларускім календаром на 2010 год.

Лявон Хлябіч з Нараўкі з зацікаўленнем прачытаў пра сваю сустрэчу, якую ён меў 12 сакавіка г.г. у Цэнтры прамоцыі рэгіёна „Чарлёнка” ў Гайнаўцы.

Варта гэта адзначыць, што ўсе экземпляры трынаццатага нумара нашага роднага часопіса раскупілі ў крамах ГСу: у Нараўцы (ля помніка за мостам) — 25 сакавіка г.г., у Старым Ляўкове — 28 сакавіка і ў Плянце — 29 сакавіка.

Гайнаўка

Вышыўка і карункі

26 сакавіка г.г. падвялі вынікі IV Павятовага агляду ручных гафтаў непрафесійных творцаў. Удзельнічала ў ім 38 асоб з Гайнаўкі, Кляшчэляў, Кузавы, Нараўкі, Нарвы, Плянты, Ставішчаў і Чаромхі.

У галіне традыцыйных узораў спецыяльную ўзнагароду журы прызначыла Лене Харкевіч з Плянты (Нараўчанская гміна), а ўзнагароды — Галіне Бірыцкай таксама з Плянты (яны і суседкі праз вуліцу) і Ніне Асташэўскай з Гайнаўкі.

У галіне сучасных узораў узнагароды атрымалі Маргарыта Краўчык з Плянты (трэцяя аднасяльчанка), Яніна Плева і Уршуля Верашчынская — абедзве з Гайнаўкі. Вылучэнне атрымалі тры жанчыны.

Спадарыня Лена Харкевіч атрымала высокую ўзнагароду за вышываныя абрусы ды ручнік з карункамі, Галіна Бірыцкая — за вышываныя ручнікі з карункамі, а Ніна Асташэўская — за абрус з карункамі ды зайздростку на акно з карункамі.

Маргарыта Краўчык атрымала ўзнагароду ў катэгорыі „сучасныя ўзоры” за абрус з карункамі ды кілім з карункі. Яніна Плева выканала цікавыя карункі для посуднай шафы.

За карункавую вышыўку ўзнагароды атрымалі Волга Давідзюк з Гайнаўкі і Крыстына Русачык з Нарвы, а вылучэнні — чатыры асобы.

Шматлікія народныя ўмельцы з Гайнаўшчыны ўдзельнічалі ў конкурсе і ў папярэднія гады. Некаторыя былі тады вылучаны, а зараз маюць узнагароды.

Агляд арганізоўвае Гайнаўскі дом культуры ды інструктаркі Зінаіда Якуць і Анна Тарасюк. Выстаўку „Вышыўка і карункі” можна агледзець да 26 красавіка г.г. у Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы па вуліцы 3 Мая, 12, у гадзінах адкрыцця і працы музея.

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Ці будзе Гайнаўцы будучыня?

(заканчэнне з папярэдняга нумара)

У Гайнаўцы нядаўна масава адрамантавалі жылыя карпусы, а крыху раней цэны кватэр у іх пабольшалі за кароткі час у 2,5 раза і трымаюцца на гэтым узроўні надалей. Гэта можа абазначаць, што гайнавяне надалей спадзяюцца на новыя месцы працы і на развіццё горада

Палітычныя і гаспадарчыя перамены ў Польшчы на зломе васьмідзесятых і дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя жыхары Гайнаўкі ўспрынялі па-рознаму. Старэйшыя глядзелі на новае не толькі з бояззю, але і адмоўна, а малодшае пакаленне ў асноўным успрыняло новую рэчаіснасць з надзеяй на лепшае жыццё. У новай рэчаіснасці частка беларусаў Гайнаўкі сваю актыўнасць накіравала ў рэчышча грамадскай дзейнасці. Хаця нельга сказаць, што Беларускі выбарчы камітэт аказаўся пераможцам у першых, ці чарговых вольных самаўрадавых выбарах, то збіраў немалую колькасць галасоў гайнавян і ў яго падтрымку сталі выступаць іншыя выбарчыя камітэты ў Гайнаўцы. Спачатку ўладу ў горадзе перанялі правыя групоўкі і трымалі яе адзін тэрмін. Пазней, ажно да сённяшняга дня, бурмістры Гайнаўкі выводзяцца з левых груповак. Праз гэты другі перыяд Беларускі выбарчы камітэт, а пасля Беларуска-народны выбарчы камітэт належалі да правячых горадам кааліцый, а іх кааліцыянтамі былі выбарчы камітэт СЛД, а пазней яго „дачка” — Самаўрадавае паразуменне Гайнаўскага павета. Радныя ад Беларускага выбарчага камітэта станавіліся старшынямі і віцэ-старшынямі рады горада, старшынямі камісій рады і намеснікамі бурмістра. Беларускі выбарчы камітэт пасля бурлівых дыскусій і стойкіх намаганняў дабіўся стварэння белгімназіі, якая дзейнічае пры Гайнаўскім белліцэі, а пазней увядзення дапаможнай беларускай мовы для зносін мясцовага насельніцтва з чыноўнікамі магістрата. Аднак, гледзячы надалей у нацыянальным плане, БНВК не дабіўся двухмоўных указальнікаў (такую пастанову прынялі радныя Арлянскай гміны).

Хаця многія беларусы з Гайнаўкі спачатку адмоўна ўспрымалі гаспадарчыя перамены ў нашай краіне, то зараз глядзяць на іх больш ласкава і бачаць таксама іх станоўчыя рэзультаты. Гайнаўскія беларусы бурна разгарнулі прыватную дзейнасць, а найбольш яскрава гэта відаць у дрэваапрацоўчай прамысловасці. Нашы людзі паадкрывалі сталярні і пачалі прымаць на працу работнікаў. Пазней стварылі вытворчыя прадпрыемствы. З 1999 года Гайнаўка ізноў стала павятовым горадам і таму ўзрасло яе адміністрацыйнае значэнне. Аднак надалей горад змагаецца з гаспадарчымі цяжкасцямі і ў час гаспадарчага крызісу стараецца вярнуцца на дарогу павольнага эканамічнага развіцця, якую можна было заўважыць у дакрызісны час. Яшчэ ў пачатку дзевяностых гадоў у Гайнаўцы жыло звыш 24,5 тысячы людзей, але з надыходам беспрацоўя маладыя гайнавяне сталі перасяляцца ў большыя гарады і ў канцы 2009 года ў прыпушчанскім горадзе было прапісаных толькі 22 679 чалавек.

Рыначная гаспадарка запаволіла развіццё горада

Пасля ўвядзення рыначнай гаспадаркі многія дзяржаўныя і кааператыўныя прадпрыемствы ў Гайнаўцы пачалі абмяжоўваць вытворчасць. Было гэта вынікам перш за ўсё агульнапольскіх тэндэнцый, паколькі ў час трансфармацыі гаспадаркі грамадзяне пачалі купляць менш прадуктаў. Менш заказаў рабілі ў Гайнаўцы айчынныя прадпрыемствы, а самая вялікая ў горадзе прыватная суполка з англійскім капіталам „Фурнель”, якая раней пераняла Гайнаўскае прадпрыемства дрэваапрацоўчай прамысловасці, таксама абмежавала прадукцыю. Спачатку работнікі гэтай суполкі зараблялі прыблізна ў два разы больш, чым работнікі дзяржаўных гайнаўскіх прадпрыемстваў, але пасля іх заробкі моцна паменшалі і ў канцы дзевяностых гадоў былі ўжо амаль самымі нізкімі ў горадзе. Пасля апошніх масавых звальненняў у фабрыцы мэблі, што належыць цяпер да групы „Фортэ” (адкупіла яна фабрыку ад суполкі „Фурнель”), працавала там толькі каля 250 чалавек (калі перад вайной было там звыш 1,5 тысячы работнікаў).

Мала работнікаў працуе таксама ў суполцы, якая дзейнічае на базе Гайнаўскага прадпрыемства сухой дыстыляцыі драўніны (надалей гайнавяне называюць яе „хімічнай”), але якраз гэтае прадпрыемства з'яўляецца заўважальным у горадзе. Нават нядаўна адзін з гайнаўскіх радных выступаў на сесіі з запытам пра магчымасць абмежавання смуроду, які разыходзіцца з гэтага завода па горадзе. У канцы 2009 года прадстаўнік суполкі „Грыфсканд”, якая пераняла „хімічную”, завяраў радных, што неўзабаве будуць пастаўлены новыя фільтры, што амаль цалкам абмяжуе смурод з комінаў. Затое „Грыфсканд” быў адной з нешматлікіх гайнаўскіх суполак, якія нават у час крызісу прымалі на працу новых работнікаў, якія звальняліся з іншых прадпрыемстваў. Напрыклад, у крызісны час моцна абмежавала прадукцыю і звальняла працаўнікоў Гайнаўскае машыннае прадпрыемства, якое зараз прыватызуецца.

— Я адышоў з працы ў Гайнаўскім машынным прадпрыемстве, бо прадукцыя паменшала там прыблізна напалову, а прынялі мяне на працу ў „хімічную”. Печак з машыннага прадпрыемства не будуць жа купляць у вялікіх колькасцях у час крызісу, а вугаль і іншая прадукцыя з „хімічнай” патрэбныя пастаянна, — заявіў спадар Аляксандр з Гайнаўкі.

Крызіс мала крануў Акруговы малочны кааператыў у Гайнаўцы, калі гаварыць пра размер прадукцыі і колькасць работнікаў у ім працуючых. Калі, напрыклад, дрэваапрацоўчыя прадпрыемствы вызначаючы цэны на свае вырабы мусяць браць пад увагу закупачныя цэны драўніны (не могуць моцна панізіць цаны сваіх вырабаў, бо прадукцыя стане нерэнтабельнай), то малочныя кааператывы, а ў гэтым ліку і гайнаўскі, могуць дазволіць сабе нават моцна панізіць цану малака, якое скупляюць. Калі нядаўна моцна панізілася цана малочнай сыравіны, гаспадары сталі наракаць, але надалей малако прадаюць. Паніжаць цэны скупкі лясной сыравіны можа таксама гайнаўскае прадпрыемства „Руна” (узнікла яно на базе Гайнаўскага прадпрыемства лясной прадукцыі „Лес”), якое займаецца продажам перапрацаваных або толькі памытых і ўпакаваных лясных пладоў, але і гэтая суполка таксама паменшала колькасць сваіх работнікаў.

У Гайнаўцы дрогнула

Аднак яшчэ да гаспадарчага крызісу ў Гайнаўцы можна было заўважыць пералом са знакам плюс. Людзі пачалі штораз лягчэй знаходзіць работу ў горадзе ў новых суполках, а многа мужчын паступіла на працу ў нарваўскі „Пронар”. Калі глянуць на маладых людзей, дык штораз больш мясцовых і прыезджых з навакольных вёсак стала ізноў выбіраць на месца пастаяннага жыхарства якраз Гайнаўку. У апошніх гадах у Гайнаўцы нарадзілася больш дзетак, чым раней, а прагнозы абнадзейваюць, што горад чакае павышэнне колькасці вучняў у школах і могуць паявіцца клопаты з месцамі ў садках. Цэны кватэр у блоках за кароткі перыяд павысіліся ў 2,5 раза і амаль столькі ж цэны дамоў у Гайнаўцы, а без заўважальнага росту попыту на жыллё, які ў галоўным сталі накручваць маладыя сужонствы, не было б ажно такога хуткага росту цэн кватэр і дамоў. На рост попыту на жыллё ў нейкі спосаб мелі ўздзеянне масавыя выезды моладзі на працу ў Вялікабрытанію, Ірландыю, Нямеччыну і іншыя заходнія краіны, асабліва з моманту далучэння Польшчы да Еўрасаюза. Пасля некалькігадовай працы за мяжой частка маладых людзей рашылася вярнуцца ў Гайнаўку і заняцца дробным бізнесам, што і зрабілі. Узніклі пры гэтым новыя месцы працы, асабліва ў паслугах. Мясцовыя прадпрымальнікі, асабліва ў галіне паслуг, таксама разгортвалі сваю дзейнасць і прымалі людзей на працу. Так, як на захадзе, малыя і сярэднія прадпрыемствы зварухнулі Гайнаўку, калі вялікія надалей змагаліся з рознымі цяжкасцямі. Перад гаспадарчым крызісам было ў Гайнаўцы замала работнікаў, асабліва мужчын і ўласнікі будаўнічых суполак сталі спазіраць на ўсход, каб адтуль сцягваць працаў-

працяг ☞ 11

Віталь ЛУБА

Да 100-годдзя з дня нараджэння

Мікалай Валынчык — акцёр са Свіслачы

У 1957 г. „Ніва” змясціла невялікую інфармацыю: „У першай палове жніўня г.г. загінуў у хвалях Віслы Мікалай Валынчык — таленавіты акцёр беларускага паходжання. (...) Адкрыў Валынчыка перад вайною вялікі Астэрва і прыняў яго да свайго Інстытута Рэдуты. Валынчык — адзін з нямногіх, якія маглі ганарыцца з афіцыйнага дыплома аб заканчэнні гэтага інстытута”.

Інфармацыя 53-гадовай даўнасці падштурхнула мяне пашукаць звестак пра жыццё і творчы шлях акцёра. Аказалася, што ўся дакументацыя тэатральнага жыцця знаходзіцца ў Тэатральным інстытуце ў Варшаве, а ў Лабараторыі дакументацыі тэатра захоўваюцца дзве персанальныя папкі з перыяду прыналежнасці Мікалая Валынчыка да Саюза артыстаў польскіх сцэн і адна папка з выразкамі прэсавых артыкулаў.

* * *

Мікалай Валынчык, сын Яна і Веранікі, нарадзіўся 21 красавіка 1910 года ў Свіслачы ў сям’і чыгуначнага работніка. Пасля заканчэння школы ў Свіслачы вучыўся ў гандлёвай школе ў Гродне. У 1930 годзе Мікалай Валынчык пачынае працаваць у Гарадскім тэатры ў Гродне інспіцыентам (памочнікам рэжысёра), а таксама іграе дробныя ролі ў спектаклях. Відаць, праца на сцэне даецца яму паспяхова, бо ў 1931 годзе прымаюць яго ў Саюз артыстаў польскіх сцэн і, як сам напіша дваццаць гадоў пазней у сваёй біяграфіі, „ад гэтага часу датуецца мая акцёрская праца”. У 1932 годзе юнага акцёра прызываюць у войска. Служыць ён у горадзе Сасновец і пасля заканчэння воінскага абавязку ў 1933 годзе застаецца на два гады працаваць у мясцовым Гарадскім тэатры. У 1935 годзе пераязджае ў Варшаву, дзе іграе ў тэатры Астэрвы і ў Польскім тэатры, а таксама вучыцца ў Інстытуце Рэдуты.

Рэдута — так называўся тэатр-лабараторыя заснаваны ў 1919 годзе Юліюшам Астэрвам і Мечыславам Ліманоўскім. У 1922 годзе пры тэатры быў створаны Інстытут Рэдуты, якога галоўнай мэтай была ўсебаковая адукацыя малодога пакалення акцёраў. Студэнты інстытута мелі заняткі па вымаўленні верша, дыкцыі, сцэнічным руху, вывучалі тэарэтычныя прадметы (гісторыя тэатра і літаратуры). Маладыя адэпты тэатральнага мастацтва выконвалі абавязкі інспіцыентаў і дзяжурных, што вучыла іх пашаны для сцэны і адказнасці за спекталь. Пасля заканчэння навукі ў Інстытуце Рэдуты Валынчык здае яшчэ прафесійны экзамен у Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва ў Варшаве.

У 1939 годзе Валынчыка ангажуе да тэатра ў Лодзі Януш Варнэцкі. Але не давялося яму даўжэй папрацаваць з лодзінскім калектывам. Калі 30 жніўня 1939 г. была аб’яўлена ўсеагульная мабілізацыя, капрал запаса проста з тэатра адправіўся ў сваю ваенную часць у Рэмбертове, затым прымаў удзел у абароне Варшавы. Пасля капітуляцыі сталіцы трапіў у нямецкі палон. Месяц пазней немцы абмяняліся з саветамі палонымі і такім чынам апынуўся ён на тэрыторыі занятай Чырвонай Арміяй. Калі апынуўся на волі, адразу паехаў у родную Свіслач.

Пасля некалькіх дзён пасля вяртання Мікалай Валынчык даведаўся, што ў Беластоку аднаўляе дзейнасць драматычны тэатр, што Аляксандр Вянгеркa, якога ён ведаў з Варшавы, камплектуе калектыў. Едзе тады ў Беласток і, як пасля напіша ў 1945 годзе, „паводле парады А. Вянгеркі, з якім сустракаўся ў Беластоку (пазней я бачыў яго ў 1941 г. перад самай вайной), прымаю прапанову дырэктара тэатра з Віцебска і еду туды ў якасці акцёра 2-й групы”.

Яўген Валынчык, брат Мікалая, успамінаў: „Заехаў яшчэ дадому на некалькі дзён. Узнікла тады праблема: у што апрануцца? Вопратка засталася ў Лодзі, а паехаць туды было ўжо немагчыма. Але нейкім чынам скамплектавалі мы яму апранахі (страціў я тады навюсенькую куртку-вятроўку, а ўзамен атрымаў мундзір) і брат паехаў у Віцебск. Там як акцёр здабыў прызнанне і папулярнасць і быў прылічаны да акцёраў 1-й групы” („Dziennik Ludowy”, nr 286, 2.12.1974).

Калі пачалася нямецка-савецкая вайна, тэатр эвакуаваўся ў горад Уральск у заходнім Казахстане, а ў 1943 годзе пераехаў у падмаскоўскае Арэхава-Зуева. Сам Мікалай Валынчык так успамінае працу ў Віцебскім тэатры: „Увесь гэты час належу да ліку вядучых акцёраў. Усе тыя пяць гадоў з’яўляюся членам Саюза савецкіх акцёраў”. У сакавіку 1944 года пры дапамозе Саюза польскіх патрыётаў і яго старшыні Ванды Васілеўскай пакідае тэатр і дабравольцам запісваецца ў Войска Польскае. Там у 3 Дывізіі I Арміі ВП працуе мастацкім кіраўніком дывізіённага тэатра, які ставіў спектаклі для франтавікоў, цывільнага насельніцтва, салдат польскіх і савецкіх часцей. Празаік-публіцыст Алейзы Срога так захаваў у памяці франтавы тэатр: „(...) І зноў у дыялогу „Кацюша” выступае непараўнаны Валынчык. На канец сцвярджае (у ролі фрыца), што многа немцаў згубіла галаву для рускіх жанчын па прычыне іх красы, а асабліва ад... Кацюшы. Урэшце апошняе „Бій немца” выконвае ўвесь калектыў”. (...) Калі трыццаць з лішнім гадоў пазней выклікаю той абразок тэатральнага спектакля над Піліцай, спецыяльнага спектакля для больш чым 500 хлопцаў, якія дабравольцамі прыйшлі з Люблінішчыны ў Народнае Войска Польскае, вяртаецца тая трапяткая ўсхваляванасць. Польскі тэатр. Польскае слова. Не ведаю ці калі-небудзь пазней у жыцці аж такое вялікае ўражанне зрабіў на мяне тэатр, як той менавіта франтавы, дывізіённы. І, хіба, не без прычыны „грамадзяніна Валынчыка” лічылі мы адным з найвыдатнейшых польскіх акцёраў” („Dziennik Ludowy”, nr 307, 29.12.1974).

Па вайне Мікалая Валынчыка запатрабаваў Польскі тэатр у Варшаве, у якім працаваў ён да 1939 г., у сувязі з чым дэмабілізавалі яго ў кастрычніку 1945 года. У сваёй біяграфіі, напісанай у 1951 годзе, ваенныя прыгоды змясціў у некалькіх словах: „Двойчы ранены на Празе. Шпіталь у Атвоцку. Некалькі медалёў, афіцэрскае званне”. З успамінаў брата Яўгена Валынчка даведваемся, што Мікалай у войску не толькі займаўся тэатрам, але ўдзельнічаў у баявых дзеяннях. Калі яго часць у жніўні 1944 года апынулася пад Варшавай, далучыўся да батальёна дабравольцаў, які меў пераправіцца цераз Віслу і прыйсці з дапамогай варшаўскім паўстанцам. На Саскай Кэмпе атрымаў ён раненні ў галаву і апынуўся ў бальніцы. А пад Калобжэгам камандаваў атрадам, якія выконваў вельмі важную ролю — збіраў з поля бою і хаваў загінуўшых. Пасля кароткіх курсаў атрымаў афіцэрскае званне. Падпаручніка Мікалая Валынчыка ўзнагародзілі медалямі „Заслужаны на ратным полі”, Сярэбраны крыж заслугі, пазней атрымаў польскі і савецкі медалі „За Варшаву”.

У пасляваеннай Варшаве Мікалай Валынчык выступаў у некалькіх тэатрах (Polski, Nowy, Rozmaitości, Powszechny), а з 1956 года да заўчаснай трагічнай смерці 1 жніўня 1957 года працаваў у Тэатры Мазавецкай Зямлі. Часопіс „Тэатр і фільм” (№ 11 (21) ад 1-15.XI.1957) у пасмяротным успаміне напісаў: „З моманту ўзнікнення Тэатра Мазавецкай Зямлі Валынчык знаходзіўся ў яго калектыве. Як некалі нёс мастацтва пад агнём на першую лінію фронту, так цяпер хацеў яго несці туды, дзе яно не даходзіла. Заўсёды ў яго былі высакародныя памкненні ў сувязі з нашым тэатрам, цешыўся яго поспехамі. Памятаеце яго пэўна ў ролі селяніна Тыбо ў „Лекары паняволі”, сакавітага Кізіла ў „Многа шуму з нічога” і поўнага годнасці ды цеплыні Эстэвана, бацькі Лаўрэнсіі ў „Авечай крыніцы”. У „Баладыне” меў зайграць Пустэльніка. Любіла яго не толькі публіка; быў пагодны, добразычлівы, заўсёды гатовы памагчы малодшаму калегу ў падрыхтоўцы ролі, быў добрым партнёрам на сцэне і ў жыцці”.

Злева: Тадэвуш Бартосік, Барбара Стэмпнякувна, Марыя Сэрачынская і Мікалай Валынчык у п’есе „Імяніны пана дырэктара” (Тэатр паўшэхны, Варшава, 1954).

Запрашаем у Чаромху

Надышла доўгачаканая вясна. Час апусціць хатні ачаг і дазволіць сабе эскапад у наваколле. А ў Чаромхаўскай гміне ёсць месца, дзе можна цудоўна правесці час на ўлонні натуры. Вось, хоць бы ўрочышча „Гданьск”. Знаходзіцца яно ў лясніцтве Чаромха, непадалёк пагранперахода Полаўцы — Пяшчатка. А дабрацца туды можна без праблемы.

За Чаромхай, не даязджаючы да чыгуначнага пуці, які вядзе з Чаромхі ў Высока-Літоўск, трэба павярнуць ад шашы направа па ўказальніку „Do zbiornika czerpania wody”. Гравейкай пад’едзем да закрытага шлагбаўма. Калі хочам пазахапляцца цудоўным краявідам акружаючага лесу, дык трэба яго абмінуць і прайсці пехатою невялічкі адрэзак у напрамку „вочка”. Гэты супрацьпа-

жарны вадаём прыспасоблены для турыстычных мэт. Тут можам сарганізаваць пікнік на ўлонні натуры за сталамі пад дахам, або спячы каўбаску на вогнішчы. Дровы ляжаць на месцы. Варта памятаць, што ў выпадку арганізавання імпрэзы, неабходна скантактавацца з ляснічым у Чаромсе, якога сядзіба змяшчаецца па вуліцы Фабрычнай (побач насычальні). Ён дазволіць адкрыць шлагбаўм і заехаць на месца аўтамабільным транспартам. Мне прыйшлося ўпершыню наведаць „Гданьск” у велікоднюю нядзелю. Цудоўнае надвор’е паспрыяла вандроўцы. Затым рэкамендую гэтае месца іншым. Паглядзіце затым здымкі.

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Гэта проста сорам !

Непадалёк жылых карпусоў пасёлка Новэ Място, зараз за прыпынкам Беласток-Стадыён пры пуці валяецца шмат папяровай ды фольгавай упакоўкі, пластмасавых бутэлек і шклатары. Гэты непрыемны абразок вымушаны аглядаць падарожныя рэйкавага аўтобуса. Ніхто з гарадскіх чыноўнікаў не зацікавіўся дагэтуль справай. Па-мойму, такая візітная картачка прыносіць не толькі сорам жыхарам пасёлка, але і ўсяму гораду. Народная мудрасць кажа: «Які пастух, такая й чарада». Варта аб тым памятаць, паважаныя кіраўнікі горада Беластока.

(ус)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Светла-радасны ўспамін пра св.п. епіскапа Мірана

На вячэрна-памінальную багаслужбу ў гонар памяці ахвяр катастрофы пад Смаленскам, якую ў дзень трагедыі, 10 красавіка г.г. адправілі ў беластоцкім саборы св. Мікалая, прыйшло многа моладзі. У навейшай гісторыі Еўропы не было такога трагічнага здарэння, калі разам з прэзідэнцкай парай загінулі б дзесяткі важных у дзяржаве асоб. Сярод 96 ахвяр катастрофы былі між іншым прэзідэнт Лех Качынскі і ягоная жонка Марыя. Наша грамадскасць падвойна смуткуе, паколькі ў катастрофе загінуў праваслаўны епіскап Міран.

Гэты памінальны артыкул пішу напярэдадні Радаўніцы — у час, калі беларусы ідуць на магілы ўшанаваць памяць родных і сваякоў. Радаўніца, як кажа сама назва свята, мае радасна-велікодны характар. Над магілай успамінаюць добрыя рысы характару памерлых, іх словы або ўчынкі. У такой светла-святочнай атмасферы мы хацелі б прыгадаць асобу епіскапа Мірана (у міры Міраслаў Хадакоўскі). Ягоная асоба важная для гісторыі „Зоркі". У днях 5-7 чэрвеня 1998 года наша рэдакцыя арганізавала ў Белавежы XIII Сустрэчы „Зоркі". На працягу трох дзён мы вучыліся пісаць прэсавую інфармацыю ды пасля заняткаў размалёўвалі каляровы крыж. Крыж пад апекай настаяцеля Сяргея Корха сустрэчнікі размалявалі разам з дзеткамі і моладдзю з Белавежы. Калі мы канчалі працу, айцец Сяргей прыйшоў з добрай навінай:

— Ну малайцы! — пахваліў ён нашу працу. — За тое будзе вам узнагарода!

Больш не сказаў ні слова. Мы дапамагалі яшчэ аздабляць зеленню царкву, паколькі набліжалася свята Тройцы. Асвячэнне крыжа прадбачвалася ў першы дзень свята, у чатыры гадзіны пасля абеду. На ўрачыстасць прыйшлі многія жыхары мястэчка, бацькі дзетак, іх сябры. Паколькі разам з намі працавалі і дзеці з каталіцкіх сем'яў, свята асвячэння крыжа спрыяла знаёмству на рэлігійным грунце. Некаторыя дзеці з Белавежы першы раз былі ў царкве!

І якая была для нас неспадзяванка, калі на ўрачыстасць асвячэння крыжа з'явіўся сам епіскап Міран. У зялёна-залатым аблачэнні, як патрабуе троіцкая традыцыя. Яго Высокапраасвяшчэнства асвяціў крыж, а пасля малітвы сказаў шмат цёплых і добрых слоў у адрас дзяцей і нашай рэдакцыі. Яго пажадальныя словы: *Няхай яшчэ больш ярка свеціць наша „Зорка" на ніве праваслаўнага грамадства* далі загаловак артыкулу рэд. Аляксандра Максімюка, які друкаваўся на першай старонцы „Нівы" № 25 ад 1998 года. Сёння, з перспектывы гадоў, магу сказаць, што словы епіскапа падтрымалі нас маральна ў далейшым дзеянні і развіцці. І зараз, калі па фінансавых прычынах мы страцілі колер, шчырыя словы епіскапа ля каляровага крыжа ў Белавежы гучаць як добрая падтрымка, зарад у змаганні за лепшае.

Як не дзіўна, роздумы пра белавежскі крыж, які зараз страціў колеры, вярнуліся да мяне ў пятніцу, дзень да катастрофы ў Смаленску. Успамін у гэты раз быў сумны і, як аказалася, сімвалічны...

Рэдакцыя „Зоркі", усе ўдзельнікі сустрэч „Зоркі", нашы сябры і сімпатыкі ў гэтыя балючыя, але асветленыя надзеяй дні, выказваюць шчырыя словы спачування сям'і і родным св.п. епіскапа Мірана. Хай зямелька будзе Яму пухам!

Ганна КАНДРАЦЮК,
Фота з архіва Зоркі

З ПАДЛЯШСКАГА СВЕТУ

Белавежа (2)

Мінулым разам пачалі мы візіт у Белавежу, пазнаёміліся з яе далёкім мінулым. Як было раней сказана, у 1795 годзе Белавежа перайшла ва ўладанне расейскіх цароў.

Паўстагоддзя пазней, у 1860 годзе, на паляванне ў Белавежу з'ехаў цар Аляксандр II. Візіт імператара быў несумненна вялікай падзеяй для жыхароў мясцовасці. Напрыканцы XIX стагоддзя іншы цар, Аляксандр III, прымае рашэнне аб пабудове ў Белавежы вялікага паляўнічага палаца. Цікавае, што першым этапам пабудовы палаца было стварэнне ў Белавежы цагельні. Пабудова палаца пачалася ў 1889 годзе, а закончылася 5 гадоў пазней, у 1894 годзе.

Як адзначаюць даследчыкі, палац у Белавежы быў вельмі шыкоўны і прыгожы. Інтэр'ер аздаблялі разьба і карціны. Цікава, што навокал палаца створаны быў амаль адмысловы раён са шматлікімі будынкамі, сярод якіх былі, між іншым, канюшня, пральня, тэлефонная станцыя, электрычны млын. Прыгажосці наваколлю палаца прыдаваў парк у ангельскім стылі, які быў створаны ў 1895 годзе. Яго часткай былі 2 ставы перасечаныя грэбляй.

Канец XIX стагоддзя ўвогуле быў даволі паспяховым для Белавежы. У 1895 годзе высвячана была царква св. Мікалая Цудатворца, а два гады пазней да мясцовасці даведзена была чыгуначная лінія. Раней, каб даехаць у Белавежу, цары і царскія чыноўнікі падарожнічалі па гэтак званым царскім гасцінцы (пра які пісалі мы ў нашым цыкле).

Белавежскі палац да нашага часу не захаваўся. У выніку ваенных дзеянняў у 1944 годзе пацярпеў ад пажару, а ў 1958 годзе вырашана разабраць будынак.

Міхась СЦЕПАНЮК

Павел Засім

Лаўрэаты „Роднага слова — 2010"!

Тыдзень раней мы назвалі лаўрэатаў першых месцаў, сёння другіх. Пра паасобныя выступленні (нават, калі яны не былі ўзнагароджаны камісіяй), і чарговых лаўрэатаў мы напішам у чарговых нумарах „Зоркі".

Журы ў асобах: д-р Васіль Сегень, Яніна Плютовіч і Іаланта Грыгарук другія месцы назначылі:

У катэгорыі: прадшколле:

Шыман Кулакоўскі, Зузана Бакер, Ксеня Клімюк з Прадшколля № 14 у Беластоку, **Маргарыта Галёнка** з Арэшкава.

Катэгорыя: класы I-III пачатковых школ: **Адрыяна Бакер** з ПШ № 4 у Беластоку, **Адрыян Мусевіч** з Аўгустова, **Дамініка Пуц** з ПШ № 3 у Гайнаўцы.

Катэгорыя: класы IV-VI пачатковых школ:

Павел Савіцкі з ПШ № 4 у Беластоку, **Караліна Рашкоўская** з Бабікаў, **Дар'я Маліш** з Аўгустова, **Мартына Панасюк** з ПШ № 3 у Гайнаўцы.

Катэгорыя: гімназія:

Юстына Давідзюк з Рыбалаў, **Кацярына Бялькевіч** з Гімназіі № 7 у Беластоку, **Караліна Янюк** і **Павел Засім** з Нараўкі.

Маргарыта Галёнка

Музыка з кайфам

Добры курс з „IQ48"

Яўген Бузоўскі

Мера развіцця грамадства гэта не толькі дэмакратычная сістэма ўлады, але перш за ўсё стаўленне да сябе грамадзян, іх заангажаванасць, але і дапаможнасць. Бачыць крыўду іншых і яшчэ падаць руку — гэта мера нашай чалавечнасці.

Дэмакратызацыя ідзе таксама ў пласце культуры, у тым ліку культуры музычнай. Выканаўцы не працуюць толькі на сваю папулярнасць, але дзякуючы сваёй папулярнасці прыцягваюць да ідэі дапамогі сваіх фанатаў. Таму ўзнікла ідэя ладзіць „Добры фэст". Слова „дабрыня" гучыць часам як са слоўніка старажытнай мовы, аднак аказваецца, што жыве ў народзе, нават часам рэалізуецца на практыцы. Ужо 22 красавіка ў Мінску пройдзе „Добры фэст" — ініцыятыва, выручаныя сродкі ад якой пойдуць на падтрымку дзяцей-інвалідаў. Кожны з удзельнікаў фэсту можа дадаткова прынесці цацкі, фарбы, кніжкі і тым падобныя падарункі неабходныя маладым грамадзянам у іхнім дзіцячым жыцці.

Варта таксама адзначыць, хто з'яўляецца арганізатарамі фэсту. Фонд „Добра тут" спалучыў свае сілы з музыкамі гурту „IQ48", а да тандэма далучылася кампанія „Будзьма беларусамі!". Самае важнае, што актыўнасць прэзентуюць музыкі. Іх паважаюць маладыя людзі, яны ставяць тым самым сябе за ўзор. Прысвячаюць яны свой час пазітыўнай ідэі ды заахвочваюць іншых ісці за імі ўслед. Як прызнаў у адной з размоў гітарыст „Здаровых ласей" Яўген Бузоўскі, не хопіць толькі спяваць пра кепскую сітуацыю, але нарэшце нешта трэба зрабіць, каб яе мяняць. У час „Добрага фэсту" добрую энергію будуць перадаваць апрача „IQ48", „Neuro Dubel", :B:N:, „ZM99", Алег Хаменка і „Палац". Пры нагодзе ў мінскім клубе „Рэактар" адкрыецца фотавыстаўка „Зваротны бок зорак" аўтарства Аляксандра Ждановіча. Усе фотаздымкі з гэтай выстаўкі можна ўжо паглядзець у інтэрнэце на сайце http://www.tarantino.by. Горача заахвочваю! Шукайце там сваіх кумірaў ды далучайцеся да высакароднай грамадскай акцыі.

i_basovka@o2.pl

Дар'я Маліш

Матвей Гаўрылюк

Валачобны падарунак Зоркі!

Дарагія сябры-дэкламатары!

Рэдакцыя „Зоркі" сфатаграфавала ўсіх дэкламатараў конкурсу „Роднае слова 2010". Сябры, які выступілі на сцэне Нараўчанскага дома культуры 24 сакавіка, могуць атрымаць у якасці валачобнага падарунка свае фотаздымкі (у лічбавым выглядзе). Думаем, што наша прапанова зацікавіць і настаўнікаў, каб такімі фатаграфіямі папоўніць школьныя хронікі.

Калі ў вас такое жаданне, напішыце нам свой інтэрнэтны адрас. Наш кантакт: zorka@niva.iig.pl

ЗОРКА

Польска-беларуская крыжаванка № 16

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 12:

Эра, балт, ярмо, кропка, ігра, граматыка, ом, Ася, смакоцці, як. Міг, крама, грам, ара, пот, ляк, траўка, Ася, конь, як.

Узнагароды, кашулькі з лагатыпам Радыё Рацыя, выйгралі **Габрысь Кузьмін** з Бельска-Падляшскага, **Магда Свентухоўская** з Новага Корніна, **Рафал Вакулюк** з Арэшкава, **Дарота Артышук** з Гайнаўкі, **Оля Івацік, Адрыян Жукоўскі, Наталля Тарасюк** з Дубін. Віншуем!



Ала ПЕТРУШКЕВІЧ

(Да 90-годдзя з дня нараджэння пісьменніка)

АЛЯКСЕЙ КАРПЮК — ураджэнец Беласточчыны

14 красавіка 2010 года спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэння Аляксея Карпюка — знакамітага беларускага празаіка, радзіма якога — вёска Страшава Беластоцкага павета. Ён пакінуў значны след у айчыннай літаратуры, быў уганараваны літаратурнай прэміяй імя Івана Мележа за кнігу прозы „Сучасны канфлікт", знаходзіўся ў цэнтры культурнага і грамадскага жыцця Гродзеншчыны ды і ўсёй Беларусі.

Калі думаю пра Аляксея Карпюка, а жыць у Гродне, жыць літаратурай і не згадваць гэтую знакавую для нашага Краю постаць нельга, успамінаю адзін выпадак з майго даўняга, студэнцкага, што было на самым пачатку 1980-х. У перапынку між лекцыямі стаю ля акна. Там — зялёны травень. Вуліца Ажэшкі аж зіхаціць свежасцю пасля цёплага вясновага дажджу. Ідзе Аляксей Карпюк. Ведаю яго як знакамітага пісьменніка, ведаю здалёк. Як і ўсе студэнткі, захапляюся ягонай „Данутай". Раптам ён збочвае з ходніка і ідзе па траве, газон якраз пад нашым акном. Згінаецца: перад ім жоўтая краска, адзіная на ўсім газоне. Звычайны малачай — цудоўнае маленькае сонца між зялёнай травы. Нейкі час узіраецца, дакранаецца да пялёсткаў-промняў. Уздымаецца і сыходзіць. Вялікі, прыгожы, статны.

У гэтым для мяне ўвесь Аляксей Карпюк. Чалавек адначасна надзвычайнай моцы і пяшчотнай, далікатнай шчырасці, што з гадамі-выпрабаваннямі не страціў здольнасці выхапіць са зменлівай, вірлівай карціны гарадской штодзённасці аскепачак жывой прыроднай красы, умення глядзець на свет дзіцячымі вачыма, захапляцца і здзіўляцца. Гэта ключ да разгадкі таго, як між творамі, дзе малюецца далёка не радасная заходнебеларуская рэчаіснасць, паўстала ў ягонай спадчыне такая ўзнёслая, шчымліва-балесная аповесць „Данута", што складаецца з трох частак. Трэцяя, якая апісвае час, калі ўсё „завярцелася" (а гэта падзеі 1939 года, Вялікая Айчынная вайна), па мастацкіх вартасцях значна ўступае першым дзвюм. Тут страчваецца тое незвычайна далікатнае, тонкае пачуццё, якім прасякнуты першыя часткі твора, якім жыве герой і праз якое ён успрымае свет. І гэта натуральна і зразумела, бо і герой у многім змяніўся. Але найперш змяніліся абставіны, бо свет стаў цалкам іншым.

Незвычайнай свежасці, далікатнасці ў адлюстраванні пачуццяў герояў беларуса Янкі Барташэвіча і генеральскай дачкі полькі Дануты Янкоўскай празаік дасягае не ў апошнюю чаргу праз легкавейныя, ледзьве ўлоўныя водары, шолахі, колеры, што ўрываюцца ў абуджаны каханнем свет душы маладога героя як найвялікшы цуд.

Пад вясковай, сялянскай, грубай, жорсткай, часам нехлямяжай знешнасцю Янкі Барташэвіча і за адпаведна гэткімі ж ягонымі паводзінамі хаваецца такая кволая, ранімая, вытанчаная душа, што прагне хараства, што здольна на самае ўзвышанае, светлае пачуццё. Ягоная грубасць — гэта і ёсць тая брудная ціна, наносная, напускная, своеасаблівая ахоўная рэакцыя ў свеце чужым, жорсткім і несправядлівым, дзе неаднойчы даводзілася зносіць абразы, пагарду, знявагу з боку нялепшых прадстаўнікоў польскай нацыянальнасці на адрас самага дарагога, роднага. Згадаем хіба самы балючы з мноства іншых выпадкаў, дзе зневажалася душа маладога чалавека:

„Неяк маці прыслала мне ў Вільню вышытую кашулю. На ўроку польскай мовы і літаратуры ўбачыў яе наш прафесар Залескі і заявіў класу:

— У Афрыцы ёсць народы, якія любяць каляровыя шкельцы, каменьчыкі, ніткі... У нас на „крэсах" гэтае дзікунства захавалася ў тым, што мясцовыя сяляне расшываюць вопратку рознакаляровымі ніткамі.

І выпешчанай рукой ён паказаў на мяне:

— Вось вам жывы прыклад!"

Цывілізаваны дзікун, прафесар-шавініст быў далёка не адзіным, хто імкнуўся прынізіць і абразіць, хто прадстаўляў не лепшы бок польскай інтэлігенцыі. Таму трэба было абараняцца, трэба было станавіцца моцным і жорсткім. А якраз з гэтага свету яна — першае і самае вялікае каханне героя, абараніцца ад якога Янка Барташэвіч не мае ніякае сілы.

Пераадоленне сябе, духоўнае ўзыходжанне Янкі Барташэвіча, ягоныя маральныя перамогі і паразы праходзяць па шляху пераадолення дысгармоніі, раздваення. І першае, што даволі лёгка ўдалося зрабіць герою, — гэта дабіцца гармоніі з душой горада.

Праблема беларуска-польскіх дачыненняў — адна з цэнтральных у творы. Дачыненні паміж прадстаўнікамі двух народаў заўсёды былі вельмі няпростымі. Аўтар не ўнікае гэтай спрадвечнай праблемы. Яна існуе на ўзроўні адносін між людзьмі, на што робяць уплыў гістарычныя, геаграфічныя, эканамічныя і іншага роду стасункі між дзяржавамі.

Заключныя старонкі аповесці хвалююць надзвычайна, гучаць як прыгожы заключны акорд вечнай тэмы. Смутак ад страты каханай, ад немажлівасці вярнуць мінулае пераплятаецца тут з радасцю вялікага адкрыцця: каханне вечнае, як вечнае само жыццё.

На жыццёвым шляху Аляксея Карпюка два гарады, якія ён любіў надзвычайна: Вільня ў маладосці і Гродна — на ўсё жыццё. Менавіта гэтаму гораду прысвечана яшчэ адна вяршыня прозы пісьменніка — раман „Карані". Гэты твор мае выключнае значэнне для ўсіх, хто звязаны з Гроднам, бо ў нашай айчыннай прозе другой паловы XX стагоддзя, бадай, не знойдзем гэткага вялікага, шырокамаштабнага мастацкага палатна, дзе б наш горад быў намаляваны са шчырай любоўю, з веданнем „жывой" гісторыі праз успрыняцце яе чалавекам, на вачах якога многія падзеі гэтай гісторыі тварыліся. Такім з'яўляецца галоўны герой твора Лаўрэн Маркевіч — вырванае з роднай глебы старое дрэва, карані якога, аднак, засталіся там, дзе пражыў усё сваё нялёгкае жыццё.

Гэта адзін з самых кранальных твораў беларускай літаратуры, які ўздымае балючыя праблемы адрыву ад родных каранёў, страты роднасці між прадстаўнікамі розных пакаленняў, адчужанасці між роднымі, кроўнымі людзьмі і між людзьмі наогул, што вядзе да непапраўных страт, да трагедыі.

Апроч гэтых праблемаў, важнае месца займае праблема гарадскога жыцця, горада як месца, дзе сканцэнтравана спрадвечная культура рэгіёна. Вобраз горада паўстае як жывы, надзвычай складаны арганізм, што патрабуе клопату, догляду, паважлівага стаўлення ўсіх ягоных жыхароў. У мастацкай прасторы рамана горад выступае не толькі месцам, дзе жывуць людзі-сучаснікі, гэта і горад юнацтва героя, што прыпала на перыяд міжваеннага дваццацігоддзя, і Гродна адразу пасля апошняй вайны.

Многія старонкі рамана „Карані" прысвечаны асобе знакамітага і на Беласточчыне паэта Міхася Васілька, чый яркі самабытны талент асабліва кранаў сэрцы простага люду. Аляксей Карпюк робіць паэта даўнім, яшчэ з часоў службы ў польскім войску, сябрам галоўнага героя. Гэта дае магчымасць аўтару расказаць пра многія старонкі жыцця Міхася Васілька, пра ягоныя погляды на грамадскі лад, пра веру ў светлыя ідэалы. І ўсё гэта пададзена па-чалавечы, па-сяброўску хораша, праз успаміны героя.

Вялікім ідэалістам быў Міхась Васілёк, верыў, што ў будучым бяскласавым грамадстве ўсё будзе дасканала. Лаўрэн згадвае пра гэта, калі аналізуе сучасную яму сітуацыю ў горадзе: п'янства, распусту. З болем гаворыць герой, што грамадства працоўных, пра якое марыў калісьці Міхась Касцевіч, атрымалася далёкім ад ідэалу.

Пра цікавы выпадак, да якога меў дачыненне сам Аляксей Карпюк, згадвае галоўны герой. На паэтычную сустрэчу са знакамітым земляком Міхасём Васільком у Скідалі сабралася шмат народу, нельга было зайсці ў набіты бітком Дом культуры. Разам з вядомым творцам на сустрэчу прыехаў малады, у тым часе нікому не вядомы празаік, якому грамада так і не дала слова, бо „ўзнялася цэлая бура: „Васілька-а!", „Міхася-а з Баброўні!", „Нашага паэ-эта", „Толькі яго хо-очам!". А выпадак гэты, што адначасна сведчыў пра сапраўды народную любоў простага люду да свайго паэта („шпарыў пра тое, што было ў людзей на душы") і непрыняцце чагосьці новага, невядомага здарыўся з аўтарам твора, як пазначае тое Аляксей Карпюк у зносцы. Гэта яго не пусцілі на сцэну, яму не далі магчымасці выступіць.

Выснова, ацэнка, якую дае Лаўрэн Міхасю Касцевічу, змяшчае ў сабе крытэрыі чалавека-працаўніка, хлебароба: „Васілёк — чалавек, які мог бы ўпэўнена сказаць, што жыў на свеце і хлеб еў недарма".

Цікавай старонкай гродзенскай гісторыі 1930-х гадоў сталі „каштанавыя бунты". Каштаны з даўніх часоў — самае распаўсюджанае ў нашым горадзе дрэва. Ды і ў Беластоку таксама. З якой пяшчотай і захапленнем, быццам дасканалы твор у хрысціянскім храме, згадвае каштанавыя алеі ў часе іх красавання галоўны герой: „Калі зацвіталі вясной гэтыя самыя каштаны, ад свечак у белых кандэлябрах не адарваць было вачэй". Тагачасны гродзенскі віцэ-прэзідэнт Цыдзік вырашыў знішчыць каштанавыя алеі, бо прызнаў гэтае дрэва нешляхетным. Вось тады горад і ўскалыхнулі сапраўдныя бунты, якія ў народзе назвалі каштанавымі.

Дзеля разгону бунту былі выкарыстаныя атрады паліцыі, моладзевай ваенізаванай арганізацыі, а ў запасе трымалі яшчэ і вайскоўцаў, якім на той час адмянілі палявое вучэнне. Гісторыя таго супраціву ў нашым горадзе закончылася традыцыйна, не на карысць гараджанам: „Дрэвы спілавалі — да апошняга, а завадатары бунту трапілі ў халодную".

Самы зялёны раён нашага горада — Пышкі, улюбёнае месца адпачынку гродзенцаў. Аляксей Карпюк знаёміць нас з трагічнай гісторыяй, што адбылася ў гэтай мясціне амаль стагоддзе таму, у гады першай сусветнай вайны, калі Пышкі сталі брацкай магілай для колішніх салдат, скалечаных у часе баёў у руска-японскай вайне.

У аснове жыццёвай філасофіі героя рамана „Карані" і ягонага аўтара тры галоўныя моманты, якія спрадвеку кіравалі светам, — парадак, сумленнасць, праўда. Гэта тры ісціны, па якіх сумленны чалавек вымярае вартасць свайго жыцця. Аляксей Карпюк, паводле шматлікіх успамінаў людзей, што блізка ведалі яго, ніколі не адступаўся ад гэтых праўдаў. Ён — адзін з тых гродзенскіх творцаў, якія вярталі насельніцтву горада яго гісторыю, марылі, каб паспаліты тутэйшы люд адчуў сябе сапраўднымі гродзенцамі, гаспадарамі, спадкаемцамі старажытнай гісторыі, вартымі жыць у каралеўскім месце.

Яшчэ адна вяршыня прозы Аляксея Карпюка — аповесць „Вершалінскі рай". Пісьменнік здолеў раскрыць спрадвечнае імкненне чалавека да лепшага праз веру, да збавення ад беспрасвецця. Людскія душы былі адкрыты да ўсяго, што давала надзею. Лёгка прымалі новых прарокаў, абманвалі сябе, у чым горка расчароўваліся, за што мелі жорсткую расплату. Зрэшты, чаму — былі? Ёсць такімі і сёння. Таму так актуальна гучаць творы Карпюка і ў наш час, калі паўстаюць ілжэпрарокі, што вядуць людзей у нікуды, у цемру. Такім новаяўленым сялянскім прарокам паўстае ў аповесці „Вершалінскі рай" звычайны селянін Гальяш Клімовіч. Народ і прарок, трагедыя прарока адлюстраваны вельмі ярка, балюча. Аднак жа

працяг ☞11

Царскія сувеніры

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

У Андрыянках на вуліцы пуставата. Галосны мужчынскі гоман чуваць з крамы, да якой уваход праз бакавы ганак прыватнай хаты. Крыху далей будынак вясковага клуба з дэпо, і з крамай. Заходжу ў тую краму. Усярэдзіне самі мужчыны, прадавец малады. На табурэтках сядзіць чатырох-пецярых мужчын. Каля прылаўка столік, на якім пустая паўлітроўка і бутэлька з крыху выпітым каляровым напоем. На адной з полак стэлажа заўважаю кілішак старога дызайну з тоўстага шкла; побач распачаты „szczeniaczek". Мужчыны сядзяць пакуль моўчкі, відаць чакаюць майго, няпрошанага туды госця, выхаду...

Бельскі шляхціч Рох Сікорскі пісаў амаль два стагоддзі таму: „Trzeba poradzić prawodawstwu, aby przy inkwizycyi zamiast chłosty, celem wykrycia prawdy, używano mocnych trunków, bo jak łeb się rozgrzeje to serce na dłoni i człowiek po pijanemu wygada się z tem, co tai będąc trzeźwym. (...) Dawniej pijaństwo to była rzecz szlachecka i wynikła z porządku politycznego, z obowiązku służenia wojskowo i z braku oświaty. (...) Przy kieliszku rozmowy były żwawsze i nawet w zgromadzeniach mniejszych bez kielicha obejść się nie było można. Wszyscy znajdowali potrzebę rozprawiania o rzeczach kraj obchodzących, a wymowa się ożywiała, serdeczność i szczerość wydobywały się na wierzch jedynie za pomocą kielichów. (...) Ustając u góry, zaraza coraz silniej rozszerzała się u dołu. Chłop poddany nie miał nic swego, oszczędzać nie potrzebował, przepijał więc co tylko miał. Arendarze żydzi umieli zachęcać do pijaństwa — i chłop dopiero podpity ulgi w swojej okropnej doli doświadczał, jak mówi ruskie przysłowie: *Kohda ja pijan to kapitan, a jak prespiusia to i świni boju sia*".

Мяркую, што ў Андрыянках жыве патрэба шляхецкага *rozprawiania o rzeczach kraj obchodzących*, бо ў публічнай тамашняй прасторы пануе польская мова і вяскоўцы хіба не з гора выпіваюць. Шмат там яшчэ сялян, якія больш увагі прыдаюць гаспадарчым збудаванням чым жылым хатам. Вясковых навамодных палацаў у Андрыянках не відаць. Найярчэйшым збудаваннем у вёсцы з'яўляецца бачная ад бельска-сямятыцкай шашы царква, якой вонкавы выгляд нядаўна адноўлены.

Крыжаўздзвіжанская царкоўка ў Андрыянках была пабудавана ў 1914 годзе. Аднак да вытокаў яе пабудовы варта вярнуцца амаль на стагоддзе раней. Вось што піша беластоцкі гісторык Юзаф Марошэк: „Władze carskie zdając sobie sprawę z roli w podtrzymywaniu polskiego ducha narodowego likwidowały klasztory w kilku etapach. W 1819 r. sformowano plan likwidacji klasztorów katolickich i przejęcia ich majątków w zachodnich guberniach cesarstwa. (...) W 1830 r. w pobliskim Brześciu, w związku z budową twierdzy wszystkie tamtejsze klasztory zamieniono na koszary wojskowe i więzienia. Powstanie listopadowe znacznie przyspieszyło proces likwidacji klasztorów. (...) 17 lipca 1832 r. ukaz carski wraz z listą likwidowanych klasztorów rozesłano do gubernatorów i władz diecezjalnych. W 1832 r. skasowano 60% katolickich klasztorów w cesarstwie. Dochód z kasaty zabierano do skarbu państwa, częściowo na uposażenie cerkwi prawosławnych". Гэтакі лёс спаткаў і кляштар ордэна рэфарматаў у Боцьках, пабудаваны пры тамашнім касцёле ў палове XVIII стагоддзя. „W 1832 r. usunięto reformatów, odtąd kościół był katolicką świątynią parafialną, a klasztor przekazano prawosławnym. W 1912 r. prawosławni rozebrali klasztor, a cegłę z rozbiórki przekazano na budowę cerkwi w Andryjankach". Ранейшая царква ў Андрыянках была пабудавана ў 1727 годзе; прыход ахопліваў яшчэ Жалоцькі і Замінова. У 1847 годзе Андрыянскі прыход налічваў 269 мужчын і 330 жанчын, у 1874 годзе — 321 мужчыну і 359 жанчын...

Царква ў Андрыянках

На ўсходнім канцы вёскі трохпавярховы будынак школы, у якім яшчэ праводзяцца заняткі. Далей, каля расхадных дарог у Боцькі і Выганова магіла і помнік паўстанцам 1863 года. У напрамку Боцькаў асфальт, у Андрыянкі і Выганова — брук. Вёска Выганова выглядае менш-больш так як і Андрыянкі — сяляне больш заняты гаспадараннем чым эстэтыкай сваіх хат; некаторыя хаты ў развалцы. За паўночнымі акраінамі вёскі абшырныя цяпліцы, над вёскай лунае пах сельскагаспадарчай дзейнасці. На старой мураванцы з кратамі ў вокнах аб'ява за прадаўшчыцай...

Разглядаюся за дарогай у напрамку Асмолі, але ўказальнікаў няма і пабойваюся павярнуць у надта ж перспектыўную жвіраванку ў цікавячым мяне напрамку; пазней гэтая асцярожнасць акажацца лепшай ад намечанага раней плана. Такім чынам іду ў напрамку Гарнова. Жвіроўка пралягае галоўным чынам праз маладыя саснова-бярозавыя лясы; відаць, што і тут сельскае гаспадаранне згортвалася акурат у той час, калі наша краіна *росла w siłę, a ludzie żyli dostatniej*. Даходжу да Гарнова, але не іду ў гэтую вёску, толькі ў бок прытуленага да яе касцёла, які ўжо на тэрыторыі аддаленай адгэтуль за два кіламетры вёскі Асмоля.

Капліца з 1826 года на могілках у Дзядковічах

Расказ пра гэты храм працытую з афіцыйнага партала Драгічынскай дыяцэзіі: „Powstanie parafii w Osmoli wiąże się ściśle z historią kościoła dziadkowickiego. W ramach represji po Powstaniu Styczniowym kościół w Dziadkowicach został odebrany katolikom i zamieniony na cerkiew prawosławną. Parafię zlikwidowano, a wszystkich wiernych przyłączono do sąsiednich parafii: Boćki, Dołubowo, Ostrożany i Siemiatycze (do 1914 roku). Po ukazaniu się carskiego ukazu tolerancyjnego w dniu 30 kwietnia 1905 roku, parafianie dziadkowiccy rozpoczęli starania o pozwolenie na budowę kaplicy (...). Pozwolenie władz carskich przyszło w 1910 roku, ale wierni nie znaleźli odpowiedniego placu pod kaplicę w Dziadkowicach. Tę okazję wykorzystali mieszkańcy Osmoli, ofiarowując 25 ha ziemi na ten cel. (...) Dnia 18 czerwca 1915 roku ks. kan. Jan Warpechowski, dziekan bielski i proboszcz boćkowski, położył i poświęcił kamień węgielny pod budowę tymczasowej kaplicy. Pod jego kierunkiem została wzniesiona drewniana kaplica pw. św. Anny. (...) Jesienią 1922 roku rozpoczęto budowę nowej, murowanej świątyni (...). Nowy kościół został oddany do użytku w 1929 roku".

Непадалёку касцёла пустуючы будынак былой школы, з выгляду „тысячагодкі". Сама вёска Асмоля не надта вялікая, некаторыя хаты руплівых гаспадароў новыя, але ў некаторых драўляных гаспадарыць ужо час. З боку Дзядковіч адслужыўшыя свой тэрмін будынкі крамы і пункту прыёму малака. Дарога ў Дзядковічы брукаваная...

У Дзядковічах іду на тамашнія могілкі, на якіх драўляная капліца характэрнага для нашых уніяцкіх храмаў дызайну. І яна, у пэўным сэнсе, знаходзіцца там дзякуючы прысутнасці ў нас царскага панавання. Менавіта пасля яго ў рэвіндыкацыйных рамках каталікі перанеслі яе ў 1916 годзе з могілак у Андрыянках на дзядковіцкія; пабудавана яна была дзевяноста гадоў раней...

Першы касцёл у Дзядковічах, пабудаваны ў XVI стагоддзі, згарэў у час шведскага „патопу", чарговы драўляны касцёл быў узведзены ў 1702 годзе, але яго канструкцыя хілілася перад наступам часу. Цяперашні касцёл у Дзядковічах быў змураваны ў 1802 годзе, у 1867 годзе перададзены праваслаўным і далучаны да Журобіцкага прыхода, у вайну 1915 года разбураны да акон, каталікам вернуты ў 1919 годзе, адбудаваны ў 1921 годзе...

Перапіс насельніцтва Мельніцкага павета ад 1662 года ўключае вёску Дзядковічы з прылягаючымі да яе Контамі. За Дзядковіцкі прыход склаў яго тамашні парох Мацей Краснадэмбскі. Самі Дзядковічы налічвалі пад семдзесят душ, Конты — пад сорак; гэта рэлятыўна невялікія лікі на той час. Пра Асмолю, Выганова і Андрыянкі згадак няма — мабыць былі яны па-за межамі тадышняга Мельніцкага павета.

Цікавыя паказанні іншага перапісу „народонаселения" ад 1906 года. У Контах пражывала 167 душ, усе яны палякі і каталікі ды карысталіся польскай мовай, ніводнае дзіця не вучылася ў школе. У Дзядковічах пражывала 133 душы, 67 з якіх лічыліся праваслаўнымі беларусамі, а 66 палякамі-каталікамі, усе яны карысталіся польскай мовай; школу ў Журобічах наведвала 11 хлопцаў і 4 дзяўчынкі. У Асмолі пражывала 325 душ польскамоўных палякаў-каталікаў, ніводнае дзіця не хадзіла ў школу. У Выганове пражывала 322 душы, усе польскамоўныя, у іх ліку 18 праваслаўных і 304 каталікі, дзеці з гэтай вёскі ў школу не хадзілі. У Андрыянках пражывала 502 душы, усе лічыліся беларусамі і гаварылі пабеларуску, у іх ліку было 22 каталікаў і 480 праваслаўных, мясцовую школу наведвала 22 хлопцаў і 6 дзяўчынак...

За мінулыя сто гадоў дэмаграфічны від тамашніх вёсак змяніўся. Не толькі ў нацыянальным і канфесійным плане, у асветніцкім таксама. І ў моўным. *Няма цара, няма парадку...*

(польскамоўныя пісьменнікі на Берасцейшчыне)

Літаратурныя падарожжы

I

Знаць Чачота ўсе павінны
І пра Зана дабрачыннасць,
Пра Касцюшку і Манюшку,
І пра песняроў.

Ф. Багушэвіч, „Песня"

Агульнавядома, што геаграфічнае месцазнаходжанне Берасцейшчыны ва ўсе часы было спрыяльным для знакамітасцей рознага кшталту. Мяне ў першую чаргу зацікавілі польскамоўныя пісьменнікі, якія мелі дачыненне да адной з заходніх абласцей Беларусі.

Гістарычныя падзеі, несумненна, уносілі свае карэктывы, аднак уплыў культуры прадстаўнікоў польскай інтэлігенцыі на выхадцаў з беларускай глыбінкі відавочны.

Нямыя сведкі гэтых стасункаў: маёнткі, паркі з рэдкімі пародамі дрэў, альтанкі, сажалкі, каплічкі — захаваліся да нашых дзён, хоць часцей знешні выгляд іх сёння засмучае. Значная частка гэтых збудаванняў звязана з імёнамі асоб, якія пакінулі незабыўны след у гісторыі краю.

Адны з іх нарадзіліся на гэтай зямлі, другія правялі тут значную частку свайго жыцця, трэція проста любілі тут бавіць вольны час.

Пачаць падарожжа варта з вёскі Воўчын, дзе захаваліся рэшткі касцёла, у якім быў ахрышчаны апошні польскі кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.

Побач з Воўчынам — вёска Грамяча. Тут, скіраваўшы ўлева ад шашы, пападаем ва ўладу векавых дрэў, што акружаюць былы маёнтак Юзафа Пузыны — аднаго з прадстаўнікоў старажытнага роду Вялікага Княства Літоўскага.

Маёнтак захаваўся да нашых дзён. Вытрыманы ў класічных формах будынак сёння найбольш прыцягвае вандалаў.

Некалі ў ім размяшчалася школа. Мы любілі з Высокага хадзіць у тым накірунку ў турыстычныя паходы, а начаваць заставаліся ў пакоях будыніны.

Прыгожая кафля з цудоўнымі ўзорамі, вітая чыгунная лесвіца на другі паверх, гулкае рэха ў высачэзных залах — гэта засталося ў памяці на ўсё жыццё.

А яшчэ сад і парк. Адна з дарожак спускаецца да рэчкі Пульвы. Прыгажосць неймаверная!

Тут, у Грамячы, у 1878 годзе нарадзіўся будучы пісьменнік і гісторык Юзаф Эдвард Пузына. Тут, на ўлонні прыроды, прайшлі яго дзіцячыя гады. Тут ён заўсёды праводзіў летнія канікулы, прыязджаючы з Варшавы, дзе вучыўся ў гімназіі.

Гімназічныя гады пакінулі незабыўны след у жыцці юнака. Усур'ёз зацікавіўшыся гісторыяй, геральдыкай і літаратурай, ён піша вершы, якія друкуюцца ў розных выданнях, спрабуе свае сілы і ў прозе.

Скончыўшы ў 1898 годзе гімназію, ён пасля смерці бацькі становіцца ўладальнікам маёнтка ў Грамячай. Але прага да ведаў прыводзіць яго ў Швейцарыю, дзе ён затрымліваецца на доўгія 20 гадоў.

Тут адбыліся значныя падзеі ў жыцці Эдварда Пузыны, галоўная з якіх — атрыманне ступені доктара філасофіі ў Фрыбургскім універсітэце. Тут ён ажаніўся

і стаў бацькам чатырох нашчадкаў. Тут да яго прыйшло сур'ёзнае зацікаўленне паходжаннем і палітычнай роляй князёў Вялікага Княства Літоўскага. Яго высновы на гэты конт выклікалі шырокі рэзананс сярод навукоўцаў еўрапейскага кшталту.

У 1905 годзе ўбачыў свет першы зборнік твораў Эдварда Пузыны „Калісь" („Ongi").

Жывучы ў Лазане, пісьменнік спачатку працуе ў Цэнтральным польскім агенцтве, пазней — у Польскім Народным Камітэце.

Адзін за другім з-пад яго пяра выходзяць патрыятычныя творы „Кракаўскае вяселле", „З пылам брацкая кроў", „Паэма сённяшняга дня", „Конрад" і іншыя.

На радзіму Эдвард Пузына вяртаецца толькі ў 1919 годзе. Пасяліўшыся ў Варшаве, працуе ў Міністэрстве замежных спраў і адначасова займаецца выдавецкай дзейнасцю. Выдае часопіс „Messager Polonais", уваходзіць у склад рэдкалегіі „Геральдычнага штомесячніка", працягвае вывучаць гісторыю Вялікага Княства Літоўскага, піша вершы.

У 1922 годзе ў Варшаве выходзіць паэтычны зборнік „Па дарозе", куды ўвайшоў і цыкл „З літоўскіх струнаў", прысвечаны Грамячай і дарагім сэрцу людзям.

Зразумела, што пры такім раскладзе жыцця было не да працы ў маёнтку Грамяча. Таму ў 1930 годзе Эдвард Пузына прадае яго разам з прылягаючымі землямі ў 731 дзесяціну.

Звольніўшыся ў 1933 годзе з працы ў Варшаве, пісьменнік пераязджае ў Вялікую Бераставіцу, што на Гарадзеншчыне. Тут ён займаецца выключна літаратурнай і навуковай дзейнасцю: перакладае з французскай, піша прозу і вершы, многа чытае.

Вайна застае яго ў Варшаве, адкуль ён быў вывезены ў Чанстахову толькі ў 1944 годзе.

Пасля вызвалення Польшчы ад нямецкіх акупантаў узначальваў аддзел культуры ў мясцовым магістраце і адначасова пісаў мемуары. А ўзяцца за пяро ў гэтым жанры яго натхніла постаць Марыі Родзевіч, знакамітай польскай пісьменніцы і дзяячкі, грамадская дзейнасць якой выклікала пашану.

„Мае ўспаміны пра Радзевічуўну" — апошняя кніга нашага земляка.

Памёр Юзэф Эдвард Пузына ў 1949 годзе. Пахаваны ў Чанстахове.

Працяг будзе

Тамара ЛАЎРАНЧУК, Высокае

Academic Network of the Grand Duchy of Lithuania Scholars

Апошнім часам у беларускім сеціве пачалі з'яўляцца артыкулы аб тым, што Вялікае Княства Літоўскае не было старажытным беларускім дзяржаўным утварэннем. Сэнс такі — найбольшую ролю ў ВКЛ адыгралі менавіта літоўскія землі, на народ якой, як на цэласную групу, і маглі толькі абаперціся вялікія князі. Прынамсі такі пункт гледжання выказвае ў сваім артыкуле „ВКЛ для лузэраў" на сайце naviny.by Стась Івашкевіч. Ён лічыць расповеды пра Вялікае Княства, як старажытнабеларускую дзяржаву нейкім недарэчным міфам. На ягоную думку станаўленне беларускай нацыі адбываецца сёння.

Калі згаджацца з такой думкай, то гісторыі ў беларусаў нібыта ўвогуле няма. Зважаючы на сённяшняе абыякавае стаўленне да беларускай культуры і мовы, падаецца, што яе ўжо і не будзе.

Дзякуй Богу, не ўсё так кепска, — тое, што ВКЛ была і застанецца беларускай спадчынай, прычым спадчынай, дзе ўзнікла беларуская народнасць, набыла свае адметныя рысы і стварыла неблагі дзяржаўны апарат, лічаць слушным не толькі сталыя гісторыкі, але і маладыя вучоныя, якім залежыць на вывучэнні мінуўшчыны роднага краю, адным са сведчанняў чаго з'яўляецца сайт „Акадэмічная сетка даследчыкаў Вялікага Княства Літоўскага" ў інтэрнэце. Месціцца гістарычны партал па адрасе http://vklonline.com.

Дызайн сайта даволі неардынарны і прывабны — на светла-карычневым выяўленні сярэднявечнай карты месцяцца назва (падаецца па-англійску), тэкст і выйсці да рубрык.

Галоўная старонка ці, як яна тут называецца — Хатняя, месціць прэзентацыю „Акадэмічнай сеткі". „Акадэмічная сетка даследчыкаў Вялікага Княства Літоўскага мае на мэце спрыянне лепшаму разуменню і талерантнасці ва Усходняй Еўропе і паляпшэнне акадэмічнага ўзроўню гісторыкаў у рэгіёне праз стварэнне ўмоваў для прафесійнага развіцця, супрацоўніцтва і інфармацыйнага абмену паміж беларускімі, літоўскімі, латвійскімі, польскімі, рускімі, украінскімі і іншымі даследчыкамі, якія займаюцца гісторыяй Вялікага Княства Літоўскага", — акрэсліваюць свае мэты аўтары партала.

Агульнае абмеркаванне значнага гістарычнага перыяду, безумоўна, дае большае паразуменне маладым гісторыкам з розных краін. І гэта дапамагае дасягненню адной з мэт сеткі — усталяванню трывалых прафесійных кантактаў паміж даследчыкамі ВКЛ і стварэнню прафесійнай Асацыяцыі даследчыкаў ВКЛ.

Вядома, не аднымі толькі гістарычнымі публікацыямі напоўнены даны сайт — рубрыка „Навіны" дае магчымасць пазнаёміцца з тымі мерапрыемствамі, што будуць праводзіцца гісторыкамі сёлета.

Цікавай з'яўляецца і рубрыка, прысвечаная сяброўству ў данай арганізацыі. Яна носіць назву „Сябры" і падае поўны пералік тых, хто ў яе ўваходзіць. Акрамя таго распавядаецца якім чынам можна ўвайсці ў „Акадэмічную сетку" — для гэта, найперш, трэба азнаёміцца з тэкстам на англійскай мове.

Даная гістарычная суполка бярэ свой пачатак у 2002 годзе. Адсачыць яе дзейнасць на працягу апошніх васьмі гадоў дазваляе падрубрыка „Каляндар", што месціцца на старонцы „Дзейнасць і планы".

Паколькі цэлая гісторыя ВКЛ была і надоўга застанецца аб'ектам зацікаўленняў значнага кола навукоўцаў, то даны сайт дапамагае з інфармацыяй аб ёй — на старонцы „Спасылкі" размечшаны адрасы адпаведных сайтаў у інтэрнэце.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Гарачая патэльня

Пакуль невядома якое месца ў летапісе беларускага хакея зойме вясна гэтага года. Зразумела адно — тое, што надышоў час пэўных перамен. Ці будуць яны радыкальнымі? Магчыма, пэўныя адказы дасць на гэтае пытанне травеньскі чэмпіянат свету. Фактычна за месяц да яго ў нацыянальнай зборнай Беларусі з'явіўся новы трэнерскі штаб. Галоўным рулявым у некаторай ступені нечакана прызначаны Эдуард Занкавец. Дагэтуль ён працаваў пераважна на асістэнцкіх пасадах, апошнія гады ў стане аднаго з лідараў расейскага хакея — санкт-пецярбургскага СКА. Праўда, раней некаторы час узначальваў зборную на другасных турнірах, прывёў мінскае „Дынама" ў 2007 годзе да чэмпіёнства ў Беларусі. Наколькі ён саспеў да паўнацэннай лідарскай работы? Пакуль відавочна былы хакеіст зборнай страхуецца, бо запрасіў ажно чатырох асістэнтаў, каб нейкім чынам падзяліць адказнасць. Дадам, што Занкавец быў апальнай асобай пры кіраванні ранейшага старшыні федэрацыі Уладзіміра Навумава, але зараз ветразі павярнуліся ў іншы бок. Новым кіраўніком федэрацыі абраны зараз Яўген Варсін, які не мае такой адыёзнай рэпутацыі, як яго папярэднік і прынамсі знешне захоўваецца больш дэмакратычна.

У памочніках галоўнага трэнера спрэс знаёмыя твары айчыннай гульні нумар адзін: Аляксандр Андрыеўскі, Андрэй Гусаў, Уладзімір Цыплакоў. Здаецца, кожны з іх мог быць прызначаны на пасаду і галоўнага. Увесь квартэт трэнераў занадта аднародны.

Пасада настаўніка зборнай Беларусі нібы гарачая патэльня. Прыкладам новы трэнер мінскага „Дынама" чэх Марэк Сікора вобразна выказаўся, што толькі самазабойца можа на яе пайсці добраахвотна. Дасведчаны спецыяліст, якому ўжо 61 год, тым не менш сам заступіў на няпросты пост. Ён павядзе „зуброў" у трэці сезон па прасторах КХЛ з адным заданнем — абавязкова трапіць па выніках рэгулярнага першынства ў плэй-оф. Яго папярэднікам, якія за два папярэднія гады мяняліся надзвычай часта, гэта не ўдалося. Калі Сікора не справіцца і над яго галавой павісне сякера.

Крытэрыі ацэнкі працы новага штаба зборнай будуць залежаць не толькі ад занятага месца (план — трапіць у васьмёрку мацнейшых — быў агучаны днямі), але і ад якасці прадэманстраванай гульні.

Ну, а што ж Міхаіл Захараў, былы правадыр зборнай і галоўны настаўнік сталічнага „Юнацтва", якое чарговы раз стала чэмпіёнам краіны? За апошні перыяд у выніку канфліктаў з прэсай і нават заўзятарамі ён пераўтварыўся проста такі ў дэманічную фігуру. Яшчэ аніводная постаць беларускага хакея не выклікала столькі адмоўнай рэакцыі і нават нянавісці. Дайшло да таго, што прыхільнікі хакея сталі збіраць па ўсёй краіне подпісы з патрабаваннем адстаўкі Захарава на пасадзе трэнера галоўнай каманды краіны. Урэшце ён ад працы са зборнай адхілены паводле афіцыйнай версіі з-за таго, што яму настала пара заняцца дружынай Украіны. Цікава, што ў яго там атрымаецца і ці ўдасца вывесці жоўта-блакітных у мацнейшы дывізіён. А вось фінальную серыю беларускай экстралігі, якая нагадвала сапраўдны трылер, Захараў выйграў зноў. Толькі ў сёмым вырашальным матчы ў авертайме „Юнацтва" дацiснула ўсё ж салігорскі „Шахцёр" — 2:1 у сустрэчы і агульныя 4-3 у фінале плэй-оф. Сталічнікі пяты раз у гісторыі ўзялі залаты тытул. А пераможцаў, як кажуць, не судзяць. Адно можна сказаць дакладна — сумна ў беларускім хакеі і вакол яго бліжэйшым часам не будзе.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

4 ☞ працяг

Будучыня Гайнаўкі

нікоў. Іншыя прадпрымальнікі рашыліся брыць на працу турэмшчыкаў, калі тыя мелі дазвол на працу па-за тэрыторыяй турмы.

Перад горадам выбар дарогі развіцця

Станоўчыя тэндэнцыі, якія ўзмацняліся ў рыначнай гаспадарцы ў Гайнаўцы, у XXI стагоддзі прытармазіў крызіс. Аднак ужо ў канцы мінулага года было відаць, што некаторыя вялікія прадпрыемствы Гайнаўшчыны выходзяць з фінансавых цяжкасцей і пачалі інвеставаць сродкі дзеля павелічэння прадукцыі, а таксама прымаюць на працу работнікаў. Гайнавяне лічаць, што надалей будзе разгортваць сваю дзейнасць „Пронар", які апошнім часам пастаянна прымае новых работнікаў. Купіў ён таксама вялікі ўчастак у Гайнаўцы, прызначаны пад прамысловую дзейнасць і людзі ў горадзе спадзяюцца на новую інвестыцыю. Малыя і сярэднія прадпрыемствы павінны надалей даваць магчымасць працаўладкавання, а гайнавяне разлічваюць таксама знайсці работу ў дрэваапрацоўчай фабрыцы групы „Ікея", што мае быць збудавана ў Арлянскай гміне, паколькі ў прыпушчанскім горадзе жыве многа спецыялістаў па дрэваапрацоўчай прамысловасці, як фізічных работнікаў, так і інжынераў.

Людзі, што змагаюцца за больш строгую ахову Белавежскай пушчы звяртаюць увагу, што шанцам для Гайнаўкі павінна быць выкарыстанне пушчы для развіцця турызму і будовы ў горадзе (на акраіне пушчы) асяродкаў для адпачынку і рэабілітацыі. Аднак хаця горад рэкламуецца разам з Белавежскай пушчай, пакуль такія асяродкі не ўзнікаюць, хаця для іх стварэння выдзелены ўчасткі з водаправодам, каналізацыяй і шыкарнай дарогай. Скептыкі гавораць, што з турызму можа выжыць толькі невялікая колькасць жыхароў горада, а паставіўшы на турызм і строгую ахову асяроддзя, Гайнаўка будзе палохаць прамыславікоў, якія не рашацца інвеставаць побач пушчы, бо будуць апасацца пратэстаў эколагаў. Бліжэйшы час павінен паказаць у якім напрамку пойдзе Гайнаўка. Павінна ж быць прынята рашэнне наконт прапанаванага павелічэння тэрыторыі Белавежскага нацыянальнага парку. Цяжка спадзявацца, што прыпушчанскі горад стане хутка развівацца, але жыхары Гайнаўкі разлічваюць на стабільнае і павольнае, але ўсё ж такі развіццё горада.

Дзе адрамантаваць гадзіннік? (яц)

Зараз у Гайнаўцы няма дзе адрамантаваць гадзіннік, калі той папсуецца. Дагэтуль быў і ў горад везлі рамантаваць гадзіннікі жыхары з усяго павета. Гайнаўка немалы горад, і каб у ім не было ні аднаго майстра ад гадзіннікаў — гэта скандал!

Я ў лесе клаў галіны на воз. Адна з крывых галін неяк адвярнулася і ўдарыла па наручным гадзінніку. Шкельца так і лопнула. 17 сакавіка паехаў я ў Гайнаўку і шукаў майстра-гадзіншчыка і распытваў людзей, ды дарма. Што ж, прыйдзецца ў Беласток з'ездзіць. А праезд жа не дармовы. Зараз білеты падаражэлі і ў аўтобусах ПКС, і ў прыватных.

Мо ўлады горада паклапоцяцца пра пункт рамонту гадзіннікаў у Гайнаўцы?

З Гайнаўкай звязаў свой лёс

Уладзімір СІДАРУК

З Эдуардам Раманоўскім сустрэліся мы ў гайнаўскім шпіталі на выратавальным аддзяленні ў сакавіку г.г. Мой кампаньён аказаўся гаваркім сукватарантам. Вось што ён расказаў у час сустрэчы.

— У Гайнаўку прыехаў я з Варшавы. Было гэта дзесяць год таму. Афарміўся я на працу ў фірме „Юпіцер", пасля яе ўзначальваў. Калі гайнаўскія маркеты абанкруціліся, дык „Юпіцер" адкупіў 200-тысячныя даўгі ў банку і пераняў маёмасць.

— Неўзабаве пазнаёміўся я з Крыстынай, — працягвае суразмоўца. — Дзяўчына спадабалася. Знаёмства замацавалі шлюбам. Купілі кватэру ў жылым пасёлку даўнейшага прадпрыемства „Лес". Пасёлак невялічкі. Чатыры жылыя карпусы складаюць адно (адзін двухпавярховы), але месца спакойнае...

— Што вас заставіла перасяліцца ў Гайнаўку? — пытаю сукватаранта.

— У час вайсковай службы я быў членам мастацкага калектыву Войск аховы пагранічча „Граніца". Выязджалі мы з канцэртамі ў адлеглыя мясціны прыгранічнай зоны. Затым лёс кінуў і на Беласточчыну. Гасцявалі ў Гайнаўцы, Белавежы і Чаромсе. Заваражыла мяне чароўнасць Белавежскай пушчы. Духмянае паветра, цішыня і спакой здаваліся быць казачным каралеўствам. І гэта паўплывала на маё рашэнне.

— Чым раней займаліся, калі гэта не сакрэт?

— Па прафесіі я спявак, — паясняе субяседнік. — Пасля ўвальнення з арміі я вярнуўся дамоў. Амаль двухгадовае прабыванне ў калектыве „Граніца" падказвала, што ў мяне артыстычныя схільнасці. Вярнуўся я затым да сваіх сяброў у мастацкі калектыў і стаў штатным членам калектыву Войск аховы пагранічча. У час прафесійнай працы прыходзілася выступаць і ў Лодзінскай аперэце, і ў Вялікім тэатры. Хвароба, аднак, не дазволіла працягваць кар'еру спевака. Я вымушаны быў падацца на пенсію па інваліднасці. Зараз я пенсіянер па ўзросце, паколькі закончыў 65 гадоў жыцця.

Як выявіў мне кампаньён, дык да сямідзесяці не хапае яму тры гады. Таму можна лічыць, што мы амаль аднагодкі. Размову вялі мы як добрыя знаёмыя, хоць у палаце прабывалі супольна ўсяго некалькі гадзін. Я расказаў прыяцелю аб працы на чыгунцы і карэспандэнцкай дзейнасці, што вельмі зацікавіла сукватаранта. На адвячорку Раманоўскага наведала жонка. У час размовы выявілася, што выходзіць яна з-пад Ласінкі, з Уснаршчыны. Мяне калега зарэкамендаваў як карэспандэнта „Нівы". У час размовы мы „пераважавалі" з паняй Крысяй мінулыя будні шасцідзесятых гадоў, калі я заязджаў у Ласінку з кінаперасоўкай, а яна паступала ў пачатковую школу. Успомнілі кіраўніка школы Сяргея Бароўскага ды іншых настаўнікаў, як і пазнейшых кіншчыкаў з Нарвы. На развітанні сімпатычная госця пачаставала шакаладам і пажадала моцнага здароўя. Праз дзве гадзіны пазней зайшла за мужам у палату, каб забраць яго дамоў.

— Я тут недалёка жыву. Паўкіламетра будзе... Дык заходзьце пры нагодзе, — сказаў на развітанне Эдуард Раманоўскі.

Мне давялося яшчэ застацца нанач у шпіталі.

8 ☞ працяг

Аляксей Карпюк

тут праз болева-трагедыйны аспект часам прабіваецца здаровы народны гумар, які ўраўнаважвае драматычную сюжэтную калізію.

У спадчыне Аляксея Карпюка не толькі празаічныя творы. Гэта і ніколі пры жыцці не апублікаваны драматычны твор „Сялянская драма" паводле аповесці „Вершалінскі рай", які нарэшце прыйшоў да чытача ў кнігазбораўскім выданні твораў пісьменніка. Гэта і ягоная палымяная публіцыстыка, сярод іншага — знакамітае выступленне на V З'ездзе пісьменнікаў Беларусі ў 1966 годзе. Захаваўся фотаздымак, на якім Аляксей Карпюк з Андрэем Макаёнкам перад тым з'ездам, на якім самай знакавай падзеяй і стане выступ гродзенскага пісьменніка, што будзе мець няпростыя наступствы для смелага выступоўцы. А яшчэ — мастацка-дакументальныя творы „Мая Джамалунгма" і пазнейшы, ужо пазацэнзурны „Развітанне з ілюзіямі", якія чытаюцца як цікавыя старонкі нашай гісторыі, напісаныя на высокім мастацкім узроўні.

Аляксей Карпюк быў вялікім рамантыкам. І глыбокім рэалістам. А яшчэ ён быў вялікім працаўніком на ніве літаратуры. Бясконцае мноства разоў перапісваў-перапрацоўваў свае творы. Напрыклад, аповесць „Данута" перапрацоўваў 32 разы.

Шчаслівая, ганаруся тым, што жыву ў ягоным Гродне, хаджу тымі вулкамі, дзе хадзіў ён. І гэтак жа, як ягоны герой Янка Барташэвіч з захапленнем пытаў сябе пра Вільню, дзіўлюся сама сабе: „Няўжо я ў Гродне?.."

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Полі Негры.

1. перыядычнае адступленне мора = 32 _ 31 _ 18 _ 58 _ 53 _;
2. лёгкая празрыстая тканіна = 21 _ 54 _ 11 _ 1 _;
3. выспа і дзяржава побач Кубы = 51 _ 46 _ 38 _ 56 _ 8 _;
4. праваднік, даведнік = 5 _ 30 _ 22 _;
5. муж бабы = 40 _ 41 _ 17 _ 45 _;
6. кітайска-казахская рака, якая ўліваецца ў Балхаш = 39 _ 43 _ 7 _;
7. частка адзення, што прылягае да шыі = 29 _ 48 _ 28 _ 10 _ 35 _ 36 _;
8. хімічны элемент Cu = 49 _ 42 _ 15 _ 16 _ 14 _;
9. установа для аховы грамадскага парадку ў Беларусі = 34 _ 6 _ 3 _ 4 _ 37 _ 55 _ 19 _;
10. грузінскі порт = 20 _ 50 _ 13 _ 52 _;
11. рэмень, якім падпярэзваюць адзенне ў таліі = 47 _ 27 _ 44 _ 33 _;
12. тэнісная адзінка з геймаў = 9 _ 2 _ 26 _;
13. вялікі швейцарскі горад = 57 _ 12 _ 23 _ 24 _ 25 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 11 нумара

Авёс, індэкс, куль, зыход, ячэйка, арыя, шанц, ячмень, смецце.

Рашэнне: **І слёзы цякуць з цячэннем.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лявону Федаруку** з Рыбал і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Чарнагорыя — шлях да незалежнасці

Юрка ЛЯШЧЫНСКІ

„Колькі вас будзе?" — пытаюцца турысты ў чарнагорца. Той жа амаль вокамгненна адказвае: „Ну, 150 мільёнаў", — а бачыўшы здзіўленне ў вачах турыстаў, дадае, не менш упэўнена: „Ну, разам з рускімі, 150 мільёнаў".

У пачатку мінулага стагоддзя адказ на такое пытанне быў падобны. Прытым не 150, а 100 мільёнаў. Вядома, разам з рускімі.

Вось такі расповед няраз чуецца ад экскурсаводаў пра Чарнагорыю і яе баявітых жыхароў.

* * *

Прарасійскія сімпатыі чарнагорцаў гэта не справа XX ці нават XIX стагоддзяў. Яшчэ 168 гадоў да Берлінскага кангрэса, падчас якога ў 1878 годзе было вырашана пра незалежнасць Чарнагорыі (прынамсі дэ-юрэ), расійскі цар Пётр I ужо прызнаў Чарнагорыю. Тады менявіта, калі Расія ваявала з Турцыяй у 1710 годзе і заклікала балканскія народы выступіць на іх баку супраць асманаў — чарнагорцы адгукнуліся станоўча. Другі раз у час японскай вайны 1905 года на баку рускага цара ваявала пяць тысяч чарнагорцаў.

Аднак увесь час гэтая незалежнасць была „няпоўнай", апрача некалькіх гадоў канца XIX і пачатку XX стагоддзяў, калі краіна сапраўды была суб'ектам міжнароднага права. А так заўсёды нейкія бліжэйшыя ці далейшыя суседзі ў большай ці меншай ступені ўладарылі над ёю. Ці гэта была Асманская імперыя, ці Аўстра-Венгерская манархія, ці Венгерская Рэспубліка. Наогул тады яе абшар быў яшчэ меншы чым цяпер, да таго яшчэ без доступу да мора.

А вось пасля I сусветнай вайны парламент гэтай горнай краіны вырашыў пра далучэнне да ўзнікаючага пасля вайны Каралеўства Сербаў, Харватаў і Славенцаў, пазней перайменаванага на Югаславію. А пасля II сусветнай вайны стала яна адной з шасці саюзных рэспублік Цітаўскай Югаславіі. Нават калі ў пачатку васьмідзесятых гадоў пачаўся распад Югаславіі, чарнагорцы як адзіныя ў рэферэндуме 1992 года прагаласавалі за супольную дзяржаву з Сербіяй — амаль 90% было за. Дарэчы, за час усіх войнаў XX стагоддзя: балканскіх, сусветных і апошняй югаслаўскай вайны — чарнагорцы ваявалі на баку Сербіі. Аднак не мінула 15 гадоў і чарнагорцы задумалі парваць палітычную сувязь з Бялградам.

Але трэба было гэта зрабіць у мірны і дэмакратычны спосаб. На зломе траўня і чэрвеня 2007 года, пасля 88 гадоў Чарнагорыя абвясціла незалежнасць. У канцы траўня (21.05.) адбыўся рэферэндум, а два тыдні пазней (05.06.) парламент афіцыйна абвясціў незалежнасць. Акурат у той гарачы час, паміж рашэннем народа і парламента, удалося мне наведаць гэтую краіну.

Што ж вырашыла аб тым, што так дыяметральна праз 15 гадоў чарнагорцы памянялі свае палітычныя імкненні? Бо ж, папраўдзе, чарнагорцы гэта ж тыя самыя, амаль што, сербы, як у Бялградзе. Доўгі час жылі ў адной дзяржаве, маюць супольную гісторыю і рэлігію (адны і другія праваслаўныя). Тая ж самая мова і алфавіт нават. Праўда, у рэферэндуме за незалежнасць прагаласавала няцэлыя 56% грамадзян, але ўсё-такі большасць. Многія тады гаварылі, што не хацелі чарнагорцы больш цярпець за палітыку Бялграда. А было гэта пасля міжнародных санкцый, накладзеных на Новую Югаславію, і натаўскіх бамбёжак за Косава. Лідар Югаславіі і галоўны віноўнік усіх няшчасцяў Слабадан Мілошавіч (дарэчы, чарнагорац па нацыянальнасці) знаходзіўся ўжо перад Міжнародным трыбуналам у Гаазе.

Праўда, у рэферэндуме за незалежнасць гэтай 670-тысячнай краіны ў асноўным выказаліся нацыянальныя і рэлігійныя меншасці. Албанцы (7%) ды баснякі (15%) ці наогул мусульмане рашуча галасавалі за адлучэнне ад Сербіі. Ну, але ж і так вырашальны голас мелі самі чарнагорцы. Напэўна, вялікую ролю, калі не галоўную, адыграў тадышні лідар Чарнагорыі Міла Дзюканавіч. Уладарыць ён з 1991 года да сёння. Даўжэй, чым Аляксандр Лукашэнка, але карацей чым Нурсултан Назарбаеў у Казахстане. Ён жа імкнуўся да адлучэння ад Сербіі. Ну і прытым была спрыяльная міжнародная атмасфера. Вось будзем самастойнай краінай, станем сябрам Еўрасаюза і г.д. і г.п. Дарэчы, Чарнагорыя, яшчэ будучы ў саюзе з Сербіяй, увяла еўра ў якасці нацыянальнай валюты. Праўда, пра чарнагорскага прэм'ер-міністра Дзюканавіча ў Сербіі, але і ў Чарнагорыі, не ўсе выказваліся з сімпатыяй. Далёка не ўсе...

— Ці Дзюканавіч, ці іншы злодзей — якая розніца? — гаварылі мне купцы на базары ў прыморскай Будве.

— Во, задумаў пажыццёва быць удзельным князем! Цяпер прэм'ер, потым задумае стаць прэзідэнтам, а потым яшчэ кімсьці! — гэтак у Бялградзе выказваўся пра Дзюканавіча наш сербскі экскурсавод.

А ў сваю чаргу пракуратура ў італьянскім Бары ўзбудзіла супраць яго крымінальную справу, быццам, за кантрабанду цыгарэт. Але гэта і так лепш, чымсьці быць абвінавачаным у тэрарызме і генацыдзе, як лідар косаўскіх албанцаў, зараз прэм'ер-міністр Косава Хашым Тачы.

Але вяртаючыся да Чарнагорыі, ці як яе на міжнароднай сцэне называюць „Монтэнэгра" з італьянскай мовы. Чым жа характэрная гэтая невялікая балканская краіна? Краіна, якую можна было б за дня абысці ўздоўж і ўпоперак, якая сваёю велічынёю меншая за нашае Падляшскае ваяводства (па плошчы і ліку насельніцтва)? Маўляў, турыст перасячэ яе нават і не звяртаючы на гэта ўвагі. О не, калі хтосьці так лічыць, дык глыбока памыляецца!

Чарнагорыя мяжуе з чатырма, а можа і пяццю дзяржавамі: Харватыяй, Босніяй, Сербіяй, Албаніяй ды ад двух гадоў з Косавам (пасля абвяшчэння незалежнасці гэтай сербскай правінцыі). Да таго яшчэ мае даволі доўгае ўзбярэжжа Адрыятыкі. Ад мястэчка Герцаг-Нові на паўночным-захадзе па Ульцынь на паўднёвым-усходзе — будзе амаль 290 кіламетраў, значыць, толькі напалову менш, чым у Польшчы ўзбярэжжа Балтыкі. Праўда, палову гэтага чарганорскага ўзбярэжжа займае Бота-Котарскі заліў. Гэта бадай ці не адзіны на абшары міжземных мораў фіёрд. Яго можна аб'ехаць на машыне (зойме 2-3 гадзіны), або часткова пераплыць на пароме, як робіць большасць турыстаў і мясцовых жыхароў. Непасрэдна ад люстра вады заліву ўзвышаюцца горы — нават да 1 300 метраў. Пры сонечным надвор'і кідаюць яны цёмны цень на заліў (толькі ўвечары і раніцай). Мабыць, адтуль і назва краіны — Чарнагорыя. Хаця на тэму паходжання назвы Чарнагорыя існуюць і іншыя легенды. Легенды таксама распавядаюць пра два невялікія астраўкі на заліве, але гэта іншая тэма.

Чарнагорыя гэта горная краіна. Знакамітая большасць яе тэрыторыі займаюць горы і ўзвышшы. Але, напрыклад, Бобатаў Кук, якому 2 523 метры і які знаходзіцца ў горным масіве Дурмітар Дынарскага нагор'я, вышэйшы за польскія Рысы. А наогул тая частка Дынарскага нагор'я характэрная шматлікімі каньёнамі. Вось, для прыкладу, каньён ракі Тара бадай ці не самы магутны ў Еўропе. Самі чарнагорцы гавораць, што большым будзе толькі каньён Каларада ў Злучаных Штатах Амерыкі. А іхны — на другім месцы ў свеце! Сапраўды, бываюць месцы, дзе амаль вертыкальна спускаецца ўніз скальная сцяна на 1000-1300 метраў. Апрача Тары, яшчэ на дзвюх горных рэчках, Морачы і Піве, ладзяць турыстычную асаблівасць — рафтынг, значыць, пантонны паход з галіны экстрэмальных спортаў.

І яшчэ адно вартае таго, каб спыніцца надаўжэй у Чарнагорыі. Гэта старажытныя гарады на ўзбярэжжы. Шмат хто чуў пра Задар, Сплiт ці жамчужыну Адрыятыкі Дуброўнік. Яны ў Харватыі. Але чарнагорскія гарады Бар, Герцаг-Нові ці ўжо асабліва Будва і Котар не менш славутыя за далмацкія.

Стары горад Будвы ці Котара (Будвы Меншае) абгароджаны сцяной. Мур раз вышэйшы, раз ніжэйшы. У Котары сягае 20 метраў вышыні і 10 шырыні ды доўгі ён на 5 кіламетраў. І самае цікавае, можна па тых мурах хадзіць, амаль наўкола. Стары горад у Котары занесены ў спісак ЮНЕСКА як помнік сусветнай культурнай спадчыны. У Будве яшчэ, здаецца, не, але і так выклікае не абыякое ўражанне. Што ж, кожнаму з іх больш чым дзве тысячы гадоў! Старажытныя грэкі, рымляне і візантыйцы ставілі тут свае палацы, храмы — адным словам, стварылі цывілізацыю.

(працяг будзе)

18.04 — 24.04

(22.03. — 20.04.) Не слухай парад малазнаёмых асоб. Некаторыя праблемы здадуцца табе невырашальнымі, ды счакай крыху, адумайся — выкарыстаеш адпаведны момант. Падтрымка сяброў — адразу калі што — хапай за тэлефон. Неспакой і разгубленасць прынясе табе квадратура Марса з Меркурыем (26-27.04.); нямілая атмасфера на працы, зайздрасць знаёмых.

(21.04. — 21.05.) Да 19.04. дагаворышся з кожным. 21-25.04. хтосьці спрабуе табе зашкодзіць; будзь асцярожным. З 23.04. (да 27.04.) чакаюць цябе бяссонныя ночы; можаш забыцца аб чымсьці вельмі важным. Адчуем патрэбу змены іміджу; пакарыстаешся добрай касметыкай, купіш прыгожае адзенне, у якім будзеш выглядаць ціп-топ.

(22.05. — 22.06.) Хтось вельмі сур'ёзна зацікавіцца табою 18.04. З 23.04. час на глыбокую рэфлексію, сцішэнне і одум над некаторымі справамі. Найважнейшае — паразуменне з асобамі, якіх ты не любіш або якія табе не жадаюць дабра. Сур'ёзна адносься да болю галавы і страўніка.

(23.06. — 23.07.) У тваім жыцці наступяць змены, якія будуць патрабаваць ад цябе дастасавання да новых акалічнасцей. Да 20.04. будзеш яшчэ меланхалічны. З 22.04. (да 26.04.) адкрыюцца перад табою новыя магчымасці. Будзеш ззяць самаўпэўненасцю і кемлівасцю.

(24.07. — 23.08.) Да 20.04. асабліва спрыяльны вецер у твае ветразі. З 23.04. (да 27.04.) вельмі ўдала правядзеш свае намеры; не слухай толькі парад іншых. Хтось будзе разлічваць на тваю падтрымку і... грошы. Не рабі нічога без роздуму!

(24.08. — 23.09.) Задбай аб адпачынак, доўгі сон і час толькі для сябе. Не з усім паспаееш і можаш блага расцаніць свае магчымасці. Свабодныя Дзевы будуць думаць, ці не ўступіць у каханні ў старую раку, ды ўсё што найлепшае было ў гэтай пары — ужо за вамі. Будзь асцярожны ў адносінах да некаторых няшчырых знаёмых.

(24.09. — 23.10.) Самотныя Шалі могуць хутка знайсці сваю другую палавінку. Найбольш паспяховае прыхарошванне сябе — 22-26.04. Пільнуйся ад спакуслівых прапаноў крэдытаў: з 21 да 25.04. ты лёгкая нажыва для абманшчыкаў.

(24.10. — 22.11.) Дбай аб сваё здароўе. Паўгадзінка ў дзень фізкультуры ці маршу паправіць тваю фігуру! Можаш адчуць патрэбу таямнічага раману. Дарэчы, шалёныя поспехі ў другога полу ўвесь месяц! Твая прысутнасць вельмі пажаданая ў кампаніях, вялікая папулярнасць. Твой гарт духа і жарснасць памогуць табе дасягнуць мэт.

(23.11. — 22.12.) Працавітая другая палова месяца; час праведзены ў фірме дасць плён у будучыні. Магчымасць бліснуць на працы ці ў школе. Увойдзеш на сваю сцежку жыцця. Варта аднак і адпачыць ды ўвесці крышынку шаленства ў сваё жыццё.

(23.12. — 20.01.) З 22.04. (да 26.04.) можаш падпісаць вельмі карысныя дамовы і кантракты. Радасць, энергія, бестурботнасць, надзея на новыя пачуцці, пазітыўнае стаўленне да жыцця, новыя задумы, дар уплыву на іншых. У пачуццях можаш дзейнічаць рашуча і адважна; ніхто табе не дасць чорнай поліўкі!

(21.01. — 19.02.) Знойдзеш цікавы спосаб на заробкі з 22.04. (да 26.04.). Будзеш прыкмечаны і пахвалены. Самотныя Вадалеі маюць шанц на каханне, а тыя што ў пары павінны пастарацца — пра каханне трэба больш дбаць! Вельмі мілыя лады ў сям'і. І варта выбрацца да доктара, які прымяняе альтэрнатыўныя спосабы лячэння.

(20.02. — 21.03.) Да 20.04. твой нос не падвядзе цябе ў інтарэсах! Шчасце да проста непраўдападобных нагод! Падпісаныя цяпер дамовы прынясуць табе ў будучыні вялікія грошы. Кіруйся голасам сэрца. Ды з 21 да 25.04. не рабі сабе лішніх надзей на трывалую сувязь.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960